Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛЮТАГА 2015 г. СУБОТА № 34 (27892) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НЕПАРЫЎНАЯ СУВЯЗЬ ГЕРАІЧНАГА МІНУЛАГА І СУЧАСНАГА

Дарагія суайчыннікі!

Паважаныя ветэраны і ваеннаслужачыя беларускай арміі!

Ад усёй душы віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Гэта ўсенароднае свята з'яўляецца сімвалам глыбокай павагі да ўсіх пакаленняў абаронцаў Айчыны і ўвасабляе непарыўную сувязь гераічнага мінулага і сучаснага.

У год 70-годдзя Вялікай Перамогі Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл набывае асаблівую значнасць. У свяшчэннай барацьбе з ворагам чалавецтва беларускія воіны паказалі прыклад найвышэйшай доблесці, стойкасці і самаадданай любові да Радзімы. Гэта свята ўсіх, хто адстаяў свабоду і незалежнасць нашай Айчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, хто прыняў эстафету ў пакалення пераможцаў і ў сучасных умовах надзейна забяспечвае бяспеку краіны.

Сёння Рэспубліка Беларусь — незалежная суверэнная дзяржава, дзе забяспечаны мір, стабільнасць і згода. І ні ў кога не павінна быць сумненняў, што так будзе і надалей, таму што абарона Айчыны ў нашай краіне мае ўсенародны характар, а Узброеныя Сілы заўсёды гатовы адэкватна адказаць на любыя выклікі і пагрозы. Жадаю вам дабра, шчасця і дабрабыту, новых поспехаў у службе і працы на карысць нашай роднай Беларусі!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЗ ПРАДУЗЯТАСЦЯЎ

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з міністрам замежных спраў Латвіі Эдгарсам Рынкевічсам. Падчас сустрэчы былі абмеркаваны адносіны Беларусі з паўночнай суседкай і з краінамі ЕС у цэлым, паведамляе БЕЛТА.**

«У нас ёсць пытанні, якія мы пастаянна павінны трымаць у полі зроку, абмяркоўваць іх і, калі атрымаецца, знаходзіць прымальныя рашэнні. У мяне якіх-небудзь прадузятасцяў у дачыненні да Латвіі ніколі не было, няма і, я спадзяюся, не будзе. Мы заўсёды знаходзілі агульную мову з нашымі партнёрамі, асабліва ў гандлёва-эканамічнай сферы. Дай бог нам з іншымі дзяржавамі так супрацоўнічаць», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

«У нас ёсць вельмі шмат праектаў па развіцці інфраструктуры, асабліва партовай у вашай дзяржаве. Я бачу, што і дзяржава, і прыватны бізнес Латвіі ідзе нам насустрач. Таму ў двухбаковых адносінах мы плануем і спадзяёмся, што, нягледзячы на некаторыя прадузятасці з боку асобных палітыкаў у Латвіі (ды і не толькі — на Захадзе), нам удасца, пераадолеўшы іх, рушыць наперад адносна супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што беларуска-латвійскія палітычныя і дыпламатычныя адносіны крыху адстаюць ад узроўню гандлёва-эканамічных. «Але гэта лепш, чым адставалі б эканамічныя і гандлёвыя адносіны. Лічу, што датычыцца палітыкі, мы заўсёды здольны нагнаць гэтае адставанне», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што Беларусь у першую чаргу ў сваёй знешняй палітыцы арыентуецца на падтрыманне моцных і дружалюбных адносін з краінамі-суседкамі. Беларускі бок таксама разлічвае на садзейнічанне Латвіі ў развіцці ўзаемадзеяння Беларусі з іншымі краінамі Еўрасаюза. Тым больш што Латвія ў першым паўгоддзі 2015 года старшынствуе ў ЕС.

У сваю чаргу Эдгарс Рынкевічс адзначыў, што ў хуткім часе ў Рызе пройдзе саміт «Усходняга партнёрства», які можа надаць новы імпульс адносінам паміж Еўрасаюзам і Беларуссю. «У нас ужо намеціліся канкрэтныя ідэі. Гэта і спрашчэнне візавага рэжыму — пачалі вельмі актыўна працаваць над гэтым. У нас ёсць магчымасці палітычнага і эканамічнага дыялогу, — заявіў міністр. — Мы ведаем той шлях, які Беларусь выбрала, мы яго паважаем. Але лічым, што мы можам таксама добра супрацоўнічаць па многіх пытаннях».

**ДАР'Я БЛАШКО, якая ўчора выступала пад нумарам 21, унесла першы залаты медаль у скарбонку зборнай Беларусі на першынстве свету па біятлоне, які гэтымі днямі праходзіць у Раўбічах.**

**Яна толькі фінішавала, як амаль адразу трапіла ў палон журналістаў. Вялікае каляровае табло высвечвала каля прозвішча Блашко прыемны нуль у графе промахаў, выдатны час, які дазваляў прэтэндаваць на вікторыю. Аднак трэба было яшчэ дачакацца завяршэння 6-кіламетровай спрынтарскай гонкі сярод дзяўчат. Даша трымала эмоцыі пры сабе. Хавала іх за прыгожай усмешкай.**

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Дар'ю Блашко з заваяваннем залатога медаля чэмпіянату свету-2015 па біятлоне сярод юнакоў і юніёраў у спрынтарскай гонцы дзяўчат (да 19 гадоў) на 6 км, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы пажадаў Дар'і Блашко далейшых поспехаў у спартыўнай кар'еры.***

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

## «ЗОЛАТА» Ў НАШАЙ ДАШЫ!

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў**

***«Цэны на паслугі санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый (за выключэннем цэн на пуцёўкі ў аздараўленчыя летнікі) дзяржавай не рэгулююцца, а самастойна вызначаюцца ўласнікамі здраўніц з улікам кан'юнктуры рынку, фактычных выдаткаў на аказанне паслуг і ўзроўню рэнтабельнасці арганізацый. Сярэдні кошт аднаго ложка-дня па пуцёўках, набытых цэнтрам за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і дзяржаўнага сацыяльнага страхавання на 2014 год, для дзяцей і дарослага насельніцтва склаў крыху больш за 252 тысячы рублёў (у 2015 годзе — Br307,8 тыс.). Для параўнання: сярэдні кошт 1 ложка-дня па пуцёўках, якія самастойна рэалізуюцца здраўніцамі юрыдычным і фізічным асобам, склаў Br373,5 тыс.; па пуцёўках, што рэалізуюцца замежным грамадзянам, — Br448,7 тыс.».***

## ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

### Насельніцтва краіны павінна быць забяспечана даступнымі і якаснымі айчыннымі лекамі

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб стане і перспектывах развіцця беларускай фармацэўтычнай прамысловасці, паведамляе БЕЛТА.**

Вытворчасць лекаў — адна з самых даходных і хуткарослых галін у свеце. «І ў нас развіццё гэтай галіны вызначана доўгатэрміновым прыярытэтам», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У Беларусі створана база для развіцця фармацэўтычнай прамысловасці. У 2010 годзе кіраўніком дзяржавы была пастаўлена задача давесці долю айчынных прэпаратаў на ўнутраным рынку да 50 працэнтаў. «Гэта адно з пытанняў нацыянальнай бяспекі. Мы павінны забяспечыць насельніцтва даступнымі якаснымі айчыннымі лекамі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што ў сучасных умовах сур'ёзную небяспеку ўяўляе пранікненне на беларускі рынак фальшывых прэпаратаў, якія могуць наносіць шкоду здароўю людзей і фінансам. Засцерагчы ад такіх пагроз у першую чаргу прызначана айчынная фармацэўтыка, лічыць кіраўнік дзяржавы.

Унутраны рынак лекаў Беларусі ацэньваецца амаль у $1 млрд, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Апошнія гады назіраецца хоць невялікі, але рост імпарту. Гэта дзіўна. Таму хачу пачуць, як рэалізуецца праграма імпартазамяшчэння ў галіне. Наколькі актыўна сюды прыцягваюцца прамыя замежныя інвестыцыі?» — спытаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да ўдзельнікаў пасяджэння.

Прэзідэнт узняў на нарадзе яшчэ шэраг актуальных пытанняў галіны. Закрануўся ход мадэрнізацыі фармпрадпрыемстваў. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся таксама, што робіцца для нарошчвання экспартнага патэнцыялу фармацэўтыкі, што стрымлівае рост экспарту беларускіх лекаў у Расію, Украіну, Казахстан і ў краіны далёкага замежжа. Акрамя таго, Прэзідэнта цікавіла, якія ёсць рэзервы для больш дынамічнага развіцця па-сапраўднаму перспектыўнай галіны, што трэба і можна сёння прапанаваць для дасягнення рэальнага прарыву ў гэтым напрамку. Разам з тым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што нельга разбураць ужо існуючыя і напрацаваныя кааперацыйныя сувязі. «Мы не павінны непрадуманымі дзеяннямі стварыць самім сабе непатрэбных канкурэнтаў на знешніх рынках. Нам важна не памыліцца. Трэба прыняць правільнае, узважанае рашэнне, нельга пайсці не ў той бок, таму што страцім час і грошы», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## КАБ ВАМ БЫЛО КАГО АБАРАНЯЦЬ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### КОРАТКА

Прадстаўнікі АСВОДа звяртаюцца да ўсіх бацькоў, педагогаў школ, выхавальнікаў дзіцячых дашкольных устаноў з просьбай не дапускаць у небяспечны перыяд выхад дзяцей на тонкі лёд.

**У кожным рэгіёне краіны адкрыты аддзяленні для санаторна-курортнага лячэння дзяцей-інвалідаў сумесна з бацькамі, якія іх суправаджаюць.**

Беларусь часова абмежавала ўвоз буйной рагатай жывёлы з Канады.

**Міністэрства гандлю за парушэнні заканадаўства закрыла ў Мінску і рэгіёнах Беларусі 12 магазінаў «Востраў чысціні» кампаніі «ЗахадХімГандаль».**

У Віцебску злодзей абакраў прыватны дом і ўцёк. З дапамогай службовага сабакі было знойдзена месца, дзе ён прыхаваў скрадзенае ружжо. Тут было выстаўлена схаванае патруляванне. І ўжо ўвечары супрацоўнікі АМАПу затрымалі падазраванага — непрацуючага, раней судзімага за крадзяжы 59-гадовага жыхара Лёзна.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### Два цягнікі сутыкнуліся ў Швейцарыі

Па папярэдніх звестках, пацярпелі каля 50 чалавек, паведамляе мясцовае выданне 20 Minuten. Звестак аб загінулых няма. Надзвычайнае здарэнне адбылося раніцай 20 лютага ў раёне горада Рафц. Паводле слоў сведак, пасля здарэння экспрэс-цягнік сышоў з рэек, але не перакуліўся, хоць, магчыма, загарэўся. Прычыны сутыкнення пакуль невядомыя. Па словах пасажыра, адзін з цягнікоў мог праехаць на чырвоны сігнал семафора.

### ЕС памыліўся наконт Украіны

Камітэт па справах ЕС Палаты лордаў брытанскага парламента заявіў, што ЕС і Вялікабрытанія памылкова ацанілі настроі ва ўкраінскім грамадстве напярэдадні крызісу. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні, размешчаным на сайце парламента Злучанага Каралеўства. Як адзначаецца ў заяве, «ЕС і ўскосна Вялікабрытанія вінаватыя ў тым, што ўмяшаліся ў гэты крызіс, дзейнічаючы падобна да лунаціка». На думку камітэта, дзяржавы — члены ЕС «страцілі палітычны кантроль» над працэсам перамоў аб асацыяцыі Украіны і ЕС. Разам з памылковай ацэнкай Расіяй імкненняў украінскага кіраўніцтва гэта прывяло да крызісу, якога не хацелі ні ў Бруселі, ні ў Маскве. Як гаворыцца ў заяве, да памылак прывёў недахоп дасведчаных аналітыкаў у знешнепалітычных структурах Вялікабрытаніі і ЕС.

### Пентагон выдаткаваў на віягру

У 2014 годзе Пентагон выдаткаваў на віягру для ваенных больш за 41 мільён долараў, яшчэ 84 мільёны выдзелілі на іншыя лекі для барацьбы з імпатэнцыяй. Пра гэта паведамляе The Military Times. З улікам гэтай лічбы за апошнія чатыры гады на прэпараты ад імпатэнцыі было выдаткавана 294 млн долараў з бюджэту. Як адзначае выданне, на гэтыя грошы можна купіць чатыры знішчальнікі пятага пакалення F-35.

ISSN 1990 - 763X

15034>

9 771990 763008

■ Прамая лінія

## ШЧЫРА ПРА КУЛЬТУРУ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**<u>Міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ</u> прыехаў у рэдакцыю «Звязды», каб адказаць на пытанні нашых чытачоў. Падчас «прамой лініі» тэлефон не змаўкаў, так што ў нас не было магчымасці ўставіць што-кольвечы сваё. Але галоўнае — вынік, які мы сёння і публікуем. У «топе» аказаліся пытанні і прапановы па бібліятэчнай справе, беларускай мове, архітэктурных помніках і кінапраектах.**

### ВЫРАТАВАЦЬ І ЗАХАВАЦЬ

**— У Магілёўскай вобласці цяжкае становішча з помнікамі архітэктуры. Быхаўскі замак знаходзіцца ў аварыйным стане, Дамініканскі касцёл у вёсцы Княжыцы, помнік барочнай архітэктуры, апошні ў Беларусі, у якім захаваўся такі архітэктурны элемент, як прапілеі, — таксама. Ці будуць праводзіцца рэстаўрацыйныя работы? (Пытанне ад чытача *з Магілёва.*)**

— Безумоўна. Шмат архітэктурных помнікаў той жа Магілёўскай вобласці ўключаны ў праграму «Замкі Беларусі», дзякуючы чаму паступова адбываецца іх рэстаўрацыя. Працэс ідзе.

**— Хачу звярнуць вашу ўвагу, што на Магілёўшчыне актыўна зносяцца старажытныя будынкі, у тым ліку са спіса помнікаў архітэктуры. Як прафесійны экскурсавод магу сказаць, што большасць гістарычных будынкаў у цэнтры Магілёва знішчана не ў вайну, а ў мірны час. Кожны год 2-3 будынкі знішчаюцца і большасць з іх — па ініцыятыве мясцовых улад.**

— У адпаведнасці з патрабаваннямі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», кантроль за станам і выкарыстаннем аб'ектаў спадчыны ўскладзены на мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя ўлады. Акрамя таго, Міністэрствам культуры падпісана пагадненне з Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь аб супрацоўніцтве ў галіне аховы спадчыны.

Але я пазначу вашыя сігналы і паспрабую разабрацца, што насамрэч адбылося. У любым выпадку, наша пазіцыя — лепш захаваць, чым аддаць на знішчэнне.

**— Звяртаюся з пытаннем па рэстаўрацыі і забеспячэнні захаванасці кальвінскага збору XVI стагоддзя, які знаходзіцца ў пасёлку Першамайск Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Выкарыстанне храма не па прызначэнні ў пасляваенны час, а затым і няўмелая кансервацыя паставілі яго на мяжу жыцця і смерці. Замест таго, каб зрабіць нармальны дах, які б захаваў помнік архітэктуры на доўгія гады, выдзеленыя дзяржавай сродкі трацяць невядома на што — нейкія пошукавыя работы з абмерамі і зандажамі. Неаднаразовыя звароты ў розныя інстанцыі заканчваліся тым, што ўласніку — Уздзенскаму ліцэю — чарговы раз даручалася зрабіць часовы дах. У выніку сцены зацякаюць, а левая вежа адкалолася ад асноўнага аб'ёму і працягвае разбурацца. Лічу, што сёння, не ўкладваючы вялікіх грошай у рэстаўрацыйныя работы, яшчэ не позна правесці граматную кансервацыю такога невялікага, але вельмі каштоўнага аб'екта нашай гісторыі. (Жыхар горада *Узда.*)**

— Міністэрства культуры 9 студзеня гэтага года арганізавала абследаванне аб'ектаў, якія ўваходзяць у склад былой сядзібы «Кухцічы». Нарада паміж прадстаўнікамі ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры, Мінскага аблвыканкама, мясцовых органаў кіравання і ўласніка даручыла Уздзенскаму ліцэю да 1 верасня 2015 года правесці пэўны шэраг работ: зрабіць з мяккіх матэрыялаў часовы дах, усталяваць па перыметры будынка сістэму водаадвода, закрыць аконныя праёмы, напрыклад, драўлянымі шчытамі, выканаць дакладку разбураных верхніх участкаў сцен цэглай або закрыць утвораныя адтуліны драўлянымі шчытамі, выканаць адмостку па перыметры будынка з мэтай адвядзення вільгаці ад сцен збору, забяспечыць высечку парасткавых, сухіх і хворых дрэў, прадугледзеўшы кампенсацыйную пасадку, і ўвогуле — падтрымліваць у належным санітарным стане прылеглую тэрыторыю.

Усе рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы, у тым ліку кансервацыя, праводзяцца адпаведна з навуковымі даследаваннямі, таму што нам трэба захаваць (ці аднавіць) тыя адметныя вартасці, якія характарызуюць стылістычныя, мастацка-архітэктурныя і іншыя асаблівасці.

СТАР. 3

■ Парламенцкі дзённік

# Пацвярджэнне даверу

**«Беларусь і Расія маюць высокі ўзровень даверу і ўзгоднена будуюць палітыку на міжнароднай арэне»,— заявіў Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч падчас афіцыйнага візіту парламенцкай дэлегацыі Беларусі ў Расію.**

На сустрэчы Міхаіла Мясніковіча з міністрам замежных спраў РФ Сяргеем Лаўровым абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння краін. На ёй абодва бакі адзначылі годны ўзровень супрацоўніцтва і тое, што Расія і Беларусь з'яўляюцца адна адной сапраўднымі паплечніцамі.

У размове са спікерам Дзяржаўнай думы Федэральнага сходу Расіі Сяргеем Нарышкіным Старшыня Савета Рэспублікі Беларусі звярнуў увагу на гарманізацыю заканадаўстваў краін ЕАЭС: «З улікам падпісання Дагавора аб ЕАЭС адкрываецца шырокая сфера дзейнасці па гарманізацыі і ўніфікацыі нацыянальных заканадаўстваў. Дагавор падпісаны, а нацыянальныя заканадаўствы засталіся ранейшымі. Прынцыповыя рознагалоссі адсутнічаюць, але інтэграцыя павінна забяспечвацца сучасным заканадаўствам, каб мы зближаліся, а не ішлі паралельна, і ні ў якім разе не разыходзіліся».

Акрамя таго, Міхаіл Мясніковіч прапанаваў «на найбліжэйшым пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, якое плануецца на 3 сакавіка, даць адпаведнае даручэнне Еўразійскай эканамічнай камісіі, якую ўзначальвае спадар Віктар Хрысценка, зрабіць свайго роду зверку». На думку сенатара, гэта дапаможа міністрам краін ЕАЭС прыняць новыя заканадаўчыя акты ці гарманізаваць іх паміж сабой.

Падчас сустрэчы з Міхаілам Мясніковічам старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціна Мацвіенка не абмінула тэму вырашэння пытання ўкраінскага канфлікту. Яна адзначыла, што Беларусь «паспяхова выканала пасярэдніцкую місію як краіна-гаспадыня, якая прымала саміт». Старшыня верхняй палаты парламента Расіі патлумачыла, што зараз галоўнае, каб абодва бакі канфлікту дакладна выканалі свае абавязкі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# Тры сцэнарыі

## ДЭПУТАТЫ АБМЕРКАВАЛІ ПРАГРАМУ ДЗЕЙНАСЦІ ЎРАДА НА ГЭТЫ ГОД

**Урад распрацаваў цэлых тры сцэнарыі развіцця эканомікі на гэты год. На такі крок пайшлі з-за непрадказальнасці цяперашніх знешніх фактараў. Папярэдні разгляд праграмы дзейнасці ўрада на 2015-ы адбыўся ўчора на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце. Кіраўнікі розных дзяржаўных міністэрстваў, ведамстваў і структур адказалі на пытанні парламентарыяў і патлумачылі, якімі прынцыпамі карысталіся падчас распрацоўкі гэтага дакумента.**

— Гэтая праграма адрозніваецца ад такога кшталту дакументаў шэрагам важных асаблівасцяў,— адзначыў **міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ** падчас выступлення перад дэпутатамі.— Праект праграмы фарміраваўся з улікам высокага ўзроўню няпэўнасці знешнеэканамічнай сітуацыі.

Па словах міністра, гэта паўплывала на неабходнасць выкарыстання сцэнарных падыходаў у праграме, а таксама на захаванне гнуткай бюджэтнай, грашова-крэдытнай і знешнеэканамічнай палітыкі. Урадам і Нацыянальным банкам распрацаваны тры сцэнарыі праграмы, і ўсе яны ўлічваюць такія фактары, як цана на нафту і дынаміка курсу расійскага рубля.

Першы сцэнарый распрацаваны, зыходзячы з сярэднегадавога кошту на нафту ў 2015 годзе $60 за барэль і курсу расійскага рубля 60 рублёў за $1. Другі сцэнарый заснаваны на разліках базавага сцэнарыя Расіі і вызначае сярэднегадавую цану на нафту на сусветных фінансавых рынках $50 за барэль і сярэднегадавы курс рубля — 61,5 рубля за $1. Трэці сцэнарый з'яўляецца, па словах міністра, стрэсавым. Ён разлічаны на сярэднегадавую цану на нафту на сусветных фінансавых рынках $40 за барэль і сярэднегадавы курс рубля — 80 расійскіх рублёў за $1. Для кожнага са сцэнарыяў распрацаваныя меры рэагавання і эканамічнай балансіроўкі, аднак, як адзначыў Уладзімір Зіноўскі, у якасці базавага сцэнарыя Прэзідыум Савета Міністраў прыняў другі.

— Ён з'яўляецца кансерватыўным — гэта значыць, горшым за цяперашнія чаканні адносна знешніх умоў развіцця эканомікі. Гэта дазваляе стварыць нейкі запас трываласці бюджэту і эканомікі ў выпадку пагаршэння знешнеэканамічнай сітуацыі. Менавіта зыходзячы з гэтага сцэнарыя праводзіцца эканамічная палітыка сёння. Пры больш спрыяльным развіцці сітуацыі, што па нашых ацэнках з'яўляецца дастаткова верагодным, урад і Нацыянальны банк будуць мець магчымасць скарэктаваць у другім паўгоддзі 2015 года эканамічную палітыку ў бок змякчэння, аднавіць некаторыя бюджэтныя прызначэнні.

Асноўнымі аспектамі праграмы дзейнасці ўрада на гэты год Уладзімір Зіноўскі лічыць зніжэнне працэнтных ставак і інфляцыі. Па яго словах, балансіроўка валютнага рынку будзе ажыццяўляцца выключна на рыначных прынцыпах пры актыўным укараненні кампенсацыйных захадаў для рэальнага сектара.

— Урад ужо рэалізаваў досыць вялікі пакет мер. Забяспечана гнуткасць абменнага курсу беларускага рубля да кошыка валют. Мы пачулі экспарцёраў і адкарэктавалі курсавую палітыку. Ліквідаваны валютны збор, адноўлена нармальная праца біржы. Зняты ўсе абмежаванні на прырост рыначнага крэдытавання пад акупныя камерцыйныя праекты. Крэдытна-дэпазітны і валютны рынак вярнуўся да звыклых прынцыпам функцыянавання.

**Галіна ФІЛІПОВІЧ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, заканадаўстве і рэгламенце,** выступіла ў падтрымку праграмы.

— Па-першае, у праграме прадстаўлены тры сцэнарыі развіцця эканомікі, што сведчыць пра ўдумлівую распрацоўку дакумента,— адзначыла дэпутат.— Я думаю, што гэтыя сцэнарыі ўзброяць нас на любую сітуацыю, якая будзе знешне складвацца ў дачыненні да Беларусі. Другі момант, які найбольш мне прыемны, гэта тое, што ў развіцці галін эканомікі захавана пераемнасць. Напрыклад, у маёй выбарчай акрузе на 2015 год запланаваны ўвод новай вытворчасці на базе адкрытага акцыянернага таварыства «Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат». Акрамя гэтага, урад запланаваў адкрыць у нас прадпрыемства па вытворчасці дубляванай нятканай тканіны на базе «Светлагорскхімвалакна». Для нас гэта два горадаўтваральныя прадпрыемствы, сэрца цэлага рэгіёна: новыя працоўныя месцы, развіццё сацыяльнай сферы.

**Аляксей КУЗЬМІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве,** пацікавіўся ў прадстаўнікоў урада, як будзе развівацца жыллёва-будаўнічы комплекс сёлета.

— Што да будаўніцтва жылля і дзяржаўнай падтрымкі, то запланавана пабудаваць 1,6 мільёна квадратных метраў жылля,— паведаміў міністр эканомікі.

**Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва,** у сваю чаргу дадаў, што сёння прадугледжана будаўніцтва арэнднага жылля за кошт крыніц бюджэту.

— У асноўным гэта абласныя бюджэты. Прапанова, каб прадпрыемствы за свае грошы будавалі жыллё і пасля яно залічвалася як арэнднае, пакуль толькі разглядаецца.

**Уладзімір ШЫЦЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах,** задаў пытанне пра забарону з 1 сакавіка гэтага года рэалізоўваць нафтапрадукты на беларускіх АЗС за замежную валюту.

— Наша краіна транзітная, мы імкнёмся прывабіць як мага больш турыстаў,— заўважыў парламентарый.— Ці можа гэта рашэнне аказаць негатыўны ўплыў на прывабнасць нашай краіны для замежнікаў? Тым больш што мы імкнёмся прыцягнуць валюту ў Беларусь…

— Усе грамадзяне павінны паважаць беларускі рубель і ўсяляк яго падтрымліваць,— лічыць Уладзімір Зіноўскі.— Ніякіх праблемных пытанняў па запраўцы: усе запраўкі на мяжы абсталяваны тэрміналамі, і ўжо даўно вядома, што можна разлічыцца за паліва карткай. Што да турызму, то, натуральна, нам важна, каб да нас прыязджалі. Але што перашкаджае купіць беларускія рублі? Калі ж мы самі жадаем выехаць за мяжу, то таксама пажадана, каб за тыя ж турпуцёўкі мы разлічваліся не валютай недзе за мяжой, а тут, памяняўшы валюту на беларускія рублі. Гэтым мы пацвярджаем, што хочам навучыць людзей давяраць сваёй валюце. Тут самае галоўнае, каб не раслі цэны: тады беларускі рубель будзе цаніцца і мець такую ж вагу, як і любая замежная валюта.

**Надзея ЮШКЕВІЧ** ■

■ Культура палітыкі

# ДЫПЛАМАТЫ І ПАЭТ

**Міністры замежных спраў Беларусі і Латвіі прынялі ўдзел у праекце Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы «У дыялогу культур», прысвечаным Міжнароднаму дню роднай мовы. У мерапрыемстве ўдзельнічалі кіраўнікі і прадстаўнікі 20 пасольстваў, акрэдытаваных у Мінску, якія чыталі вершы на родных мовах.**

Міністр замежных спраў Латвіі Эдгарс Рынкевічс распавёў аб тым, што культура з'яўляецца тым вельмі важным элементам, які звязвае Беларусь і Латвію. Нагадаў аб сяброўстве Янкі Купалы з латвійскім паэтам Янам Райнісам, 150-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца ў 2015 годзе. На думку Уладзіміра Макея, Янка Купала — адзін з лепшых прадстаўнікоў беларускага народа, які вучыў, як трэба любіць, абараняць, умацоўваць і шанаваць сваю Бацькаўшчыну. «Сёння можна сказаць, што мара беларускага песняра пачала здзяйсняцца — беларускі народ мае сваю дзяржаву і ганарыцца сваёй Радзімай», — заўважыў беларускі міністр. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі прачытаў верш Янкі Купалы «Бацькаўшчына».

Уладзімір Макей дамовіўся з кіраўніцтвам музея аб сумесным правядзенні праекта «У дыялогу культур» у 2016 годзе.

Дарэчы, гэта не адзіны сумесны праект музея і Міністэрства замежных спраў Беларусі. 4 сакавіка адбудзецца ўрачыстае адкрыццё выставы жывапісу і графікі беларускіх мастакоў «Янка Купала: клічу вас я на пабеду».

**Ул. інф.**

■ Не словам, а справай

# Што перашкаджае мадэрнізацыі?

**У Мінску адбылося чарговае пасяджэнне Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Беларусі. Асноўным пытаннем для абмеркавання стала прыцягненне прыватнага бізнесу ў мадэрнізацыю эканомікі.**

«Такі парадак дня невыпадковы,— заявіў старшыня савета Пётр Пракаповіч.— Вы ўсе памятаеце, што два гады таму падчас сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі мы атрымалі ад кіраўніка краіны шэраг задач. І на першым месцы сярод іх — актывізацыя і прыцягненне бізнесу ў мадэрнізацыю айчыннай эканомікі. Менавіта пытанні мадэрнізацыі для нас з'яўляюцца галоўнымі. Толькі ў выніку яе мы можам вырашыць пытанні павышэння канкурэнтаздольнасці нашай эканомікі, заваявання ўнутранага і знешніх рынкаў. Тым больш рынку Еўразійскага эканамічнага саюза». Кіраўнік савета звярнуў увагу на тое, што праблем у краіне шмат, а савет пры Прэзідэнце толькі адзін — па развіцці прадпрымальніцтва. Гэта сведчыць пра тое, што дзяржава разумее важнасць зладжанай працы менавіта гэтай сферы. А значыць, і бізнес павінен у сваю чаргу разумець асабістую адказнасць за развіццё краіны.

Так, сёння яшчэ хапае перашкод на шляху бізнесмена. Скажам, кошт крэдытных рэсурсаў, недахоп кваліфікаваных кадраў, высокая арэндная плата, бюракратызм… Як шчыра прызнаюць члены савета, гэтыя болевыя кропкі не змяняюцца ад пасяджэння да пасяджэння. Але ж і без праблем таксама быць не можа. Абсалютна гладка не будзе ніколі. Можна толькі старацца ўсе пытанні як мага больш аператыўна і эфектыўна вырашаць. Як падтрымаць тых, хто гатовы працаваць і прыносіць карысць сваёй краіне? А хто перашкаджае развіццю перспектыўных прадпрыемстваў проста так — ад няма чаго рабіць? Дзе ён — баланс паміж эканамічнай эфектыўнасцю і сацыяльнай адказнасцю бізнесу? На гэтыя і іншыя пытанні спрабавалі знайсці адказ лідары бізнес-супольнасці Беларусі.

*Падрабязнасці чытайце ў бліжэйшых нумарах «Звязды».*

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ** ■

# «ЗОЛАТА» Ў НАШАЙ ДАШЫ!

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***




А вось яе бабулі Лідзіі Клаўдзіеўне зрабіць гэта было складана:

— Яна ў нас малайчынка, разумніца,— хваліць унучку расчуленая жанчына.— Я ганаруся ёю! Дай ёй Бог здароўечка! Для яе гэта пакуль самае галоўнае дасягненне. Адразу стэлефанавалася з мамай Дашы. Усе ў эйфарыі.

Лідзія Клаўдзіеўна жыве ў Стоўбцах. А таму, каб трапіць у Раўбічы, прачнулася а 5 гадзіне раніцы і разам з пляменнікамі паехала падтрымліваць сваю спартсменку. Кажа, што вельмі хвалявалася, чакала, калі атрымаецца ўбачыць унучку. У выніку павіншавала яе з перамогай.

Учора трэнераў, балельшчыкаў парадавалі і Дашыны сяброўкі па камандзе. Дзінара Алімбекава прадэманстравала таксама выдатную стральбу, але спынілася ў кроку ад п'едэстала. А вось Ганна Сола дапусціла на стрэльбішчы адну памылку, падзяліўшы пятую пазіцыю з расіянкай Лізаветай Каплінай. Другое месца заняла аўстрыйка Юлія Швайгер, на трэцім — Інгрыд Ландмарк Тандрэволд, сярэбраны прызёр індывідуальнай гонкі.

— Вельмі рада за сваіх сяброўак па камандзе,— прызналася Ганна Сола.— Мы ўсе стараемся падтрымліваць адна адну ў цяжкую хвіліну. Хто ж нас яшчэ так падтрымае? Мы пастаянна разам.

Прыемна, што ў гэты дзень на вышыні былі і нашы заўзятары. Зразумела, пятніца — дзень працоўны. Прыехаць на першынство маглі далёка не ўсе ахвотныя. Але той, хто апынуўся ў сонечных Раўбічах, голасу не шкадаваў і «хварэў» за сваіх на ўсю моц. Можна толькі здагадвацца, што падчас гонак будзе сёння і заўтра, калі трыбуны будуць цалкам запоўненыя.

На хлопцаў, якія стартавалі пасля, у заўзятараў таксама былі надзеі. Аднак спрынт ім узнагарод не прынёс. Ніхто з беларусаў так і не здолеў адстраляцца без промахаў. Найвышэйшае, 9-е, месца заняў Раман Шынкевіч. Гонка для яго насамрэч складвалася, але два промахі перакрэслілі ўсе медальныя перспектывы…

— Спачатку было ўсё добра, але на стойцы здарылася тое, чаму сам не знаходжу тлумачэння,— прызнаўся Раман.— А я так рыхтаваўся да гэтай гонкі. Нават клаўся спаць з думкамі аб чэмпіянаце… Што рабіць, буду рыхтаваць сябе і надалей на добры вынік. Ёсць да чаго імкнуцца.

Перамогу ў гонцы атрымаў нарвежац Ёнас Углем Мобакен.

**Аляксандр СЫМАН,**
**старшы трэнер маладзёжнай зборнай Беларусі па біятлоне:**

***— Дзяўчаты парадавалі балельшчыкаў, усю краіну і прадэманстравалі вельмі добры вынік. Першае, чацвёртае і пятае месцы — даволі яркае выступленне. Пры гэтым у нечым падобныя вынікі былі чаканыя, бо біятланісткі ўпэўнена сябе паказвалі на этапах Кубка IBU сярод жанчын. Будзем і надалей адсочваць таленавітых спартсменак, берагчы і рыхтаваць да дарослага спорту як рэзерв нацыянальнай каманды.***

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота аўтара.**



■ Погляд

# НА ПІКУ АДНОСІН:

## ПЕРСПЕКТЫВЫ КІТАЙСКА-БЕЛАРУСКАГА ПАРТНЁРСТВА

**2015 год Кітай упершыню сустрэў у якасці прызнанага сусветнага лідара па аб'ёме эканомікі — па выніках 2014 года, яго ВУП, падлічаны зыходзячы з парытэту пакупной здольнасці, перасягнуў ВУП ЗША. Даволі доўгім быў шлях да гэтага рэкорда, і ён відавочна не будзе апошнім. Дастаткова ўспомніць, як дзівіліся многія ў 2009 годзе выхаду Кітая на першае месца ў свеце па экспарце тавараў. А сёння гэта ўжо ўспрымаецца як штодзённасць — а як жа інакш? Гэта ж Кітай!**

Тым больш прыемна нам у Беларусі ўсведамляць, што такая магутная краіна цэніць цесныя адносіны з Беларуссю, якія па нарастальнай развіваюцца з сярэдзіны 1990-х гадоў, і неаднаразова пацвердзіла згоду на выбудоўванне адносін стратэгічнага партнёрства. Велізарны патэнцыял кітайскай эканомікі, здавалася б, адкрывае велізарныя магчымасці для Беларусі. Разам з тым не ўсё так проста.

Па-першае, як бы значна ні выглядалі поспехі Кітая, узровень ВУП, які прыпадае на аднаго кітайца, усё яшчэ прыкладна ў паўтара раза ніжэйшы, чым прыпадае на аднаго грамадзяніна Беларусі. У сувязі з гэтым кіраўніцтва краіны праводзіць вельмі актыўную палітыку па росце эканомікі, у тым ліку за кошт нарошчвання экспарту, каб з часам выйсці на больш уражальны ўзровень жыцця насельніцтва. Гэта добра для Кітая. Але не так добра для многіх краін, прадукцыя якіх выцясняецца з сусветных рынкаў кітайскай. І Беларусь тут не выключэнне. Многія беларускія прадпрыемствы, якія раней паспяхова прадавалі тавары за мяжой, саступілі сваю нішу на замежных рынках буйнейшым кітайскім прадпрыемствам. Не стаў выключэннем і ўнутраны рынак. Нягледзячы на сур'ёзныя поспехі ў 2014 годзе (экспарт беларускай прадукцыі ў Кітай вырас на 46,6 працэнта, а імпарт у Беларусь кітайскай прадукцыі скараціўся на 16,2 працэнта), адмоўнае сальда для беларускага боку ўсё яшчэ застаецца вельмі вялікім — 1655,9 млрд долараў. Гэта не вельмі адрозніваецца ад сітуацыі ў знешнім гандлі Кітая з многімі краінамі. Вялікае адмоўнае сальда ў гандлі ёсць, напрыклад, і ў нашай суседкі Польшчы, у якой, згодна з нядаўнім апытаннем прадпрымальнікаў, 76 працэнтаў з іх лічаць за лепшае імпартаваць тавары з Кітая, а не экспартаваць польскія ў Кітай. Кітайцы бліскуча навучыліся рабіць такі ўражальны асартымент тавараў і камплектуючых, што з імі вельмі цяжка канкурыраваць.

Па-другое, вельмі важная перавага Кітая — вялізныя і адносна танныя фінансавыя рэсурсы, якія ў вялікай колькасці выдзяляюцца сваім прадпрыемствам. Золатавалютныя рэсурсы Кітая падышлі да мяжы ў 4 трыльёны долараў, не кажучы ўжо пра некалькі дзяржаўных фондаў, што валодаюць сотнямі мільярдаў долараў, і велізарныя актывы ў найбуйнейшых у свеце кітайскіх банкаў. І кітайцы не схільныя рабіць крокі, каб дапамагаць канкурэнтам на сусветных рынках, якімі б трывалымі ні былі палітычныя адносіны. Так, пераважная большасць крэдытаў, атрыманых Беларуссю, былі афармлены як «звязаныя» — каб атрымаць неабходныя крэдытныя рэсурсы, мы бралі на сябе абавязацельства купляць на частку выдадзеных сродкаў кітайскія станкі і камплектуючыя, а таксама выкарыстоўваць кітайскіх работнікаў. На больш выгаднае для Беларусі супрацоўніцтва кітайскі бок пакуль не ідзе. Так, Беларусбанк ужо сем гадоў як адкрыў сваё прадстаўніцтва ў Кітаі, але ніводны з кітайскіх банкаў на падобны крок у Беларусі яшчэ не пайшоў.

Па-трэцяе, не вельмі спрыяльны фон стварае геапалітычная сітуацыя. Рэзкія супярэчнасці паміж Расіяй і Захадам, уключаючы ўзаемныя санкцыі, а таксама грамадзянская вайна ў суседняй Украіне, змяншаюць інтарэс у кітайскіх інвестараў у нашым рэгіёне. Кітайцы — выдатныя бізнесмены і не хочуць рызыкаваць дарэмна.

Таму, каб дадаць да цудоўных палітычных адносін яшчэ і выгадную для Беларусі эканамічную дынаміку, неабходна ісці на нестандартныя крокі. Адным з іх з'яўляецца запуск Беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка. Буйныя кітайскія карпарацыі ZTE і Huawei ўжо выказалі згоду інвеставаць у іх. Адна з ключавых задач — уцягнуць у дзейнасць парка і іншыя буйныя карпарацыі, чаму могуць паспрыяць перамовы падчас чаканага ў маі візіту старшыні КНР Сі Цзіньпіна.

Неабходна ўмела нарошчваць экспарт у Кітай, знаходзячы новыя нішы, якія не здольны заняць самі кітайцы. З ростам дабрабыту насельніцтва, усё большым попытам у заможных грамадзян КНР карыстаюцца імпартныя тавары раскошы. У тым ліку, і зробленыя ў Еўропе. Наколькі беларускія прадпрыемствы гатовы заняць гэтую нішу і зарабіць вялікія грошы для краіны?

Незвычайна перспектыўны сегмент выязнога турызму. Кітайцы ўжо трывала выйшлі на турыстычны рынак свету ў якасці турыста нумар адзін, патраціўшы толькі за мінулы год каля 150 мільярдаў долараў за мяжой на гэтыя мэты. На жаль, гэтыя грошы прайшлі міма нас. Наколькі мы гатовы канкурыраваць з іншымі краінамі, каб частка гэтых грошай была ў будучыні патрачана кітайскімі турыстамі ў Беларусі?

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук** ■

■ Падпіска-2015

Звязда. Да чытача з любоўю!

# Падпісацца можна яшчэ танней

Адышла навагодняя і калядная мітусня, зіма падыходзіць да свайго каляндарнага заканчэння, а наперадзе — ізноў святы. Тут і Масленіца, і 23 Лютага, і Сусветны дзень жанчын! З чым мы і віншуем нашых чытачоў! Віншуем і…

**Выдавецкі дом «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» з 20 лютага па 10 сакавіка** праводзіць акцыю, у рамках якой **любы чытач можа падпісацца на газету «Звязда»** і іншыя перыядычныя выданні выдавецкага дома **са зніжкай (падпісны перыяд — сакавік — чэрвень 2015 года).**

Ільготная падпіска для індывідуальных падпісчыкаў будзе каштаваць:

| Індэкс | Назва выдання | На 1 месяц | На 3 месяцы |
|---|---|---|---|
| 638504 | Газета «Звязда» | 56150 | 168450 |
| 638564 | Газета «Літаратура і мастацтва» | 28600 | 85800 |
| 749954 | Часопіс «Алеся» | 23350 | 70050 |
| 748224 | Часопіс «Бярозка» | 19250 | 57750 |
| 748444 | Часопіс «Вожык» | 26300 | 78900 |
| 749574 | Часопіс «Маладосць» | 26150 | 78450 |
| 749684 | Часопіс «Нёман» | 29350 | 88050 |
| 749854 | Часопіс «Полымя» | 29000 | 87000 |
| 749264 | Часопіс «Родная прырода» | 44850 | 134550 |

***Падпіска да запатрабавання на паштовым аддзяленні сувязі — яшчэ таннейшая. Не згубіце шанц застацца са сваім любімым выданнем і пры гэтым сэканоміць!***

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### РОЎНЫЯ ПРАВЫ — УСІМ ДЗЕЦЯМ-СІРОТАМ

**Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 лютага 2015 года №70 прадугледжвае выплату ў поўным аб'ёме пенсій дзецям-сіротам і дзецям, што засталіся без апекі бацькоў, якія знаходзяцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу.**

Як патлумачылі ў Міністэрстве адукацыі, да прыняцця ўказа выплата ў поўным аб'ёме пенсій ажыццяўлялася толькі выхаванцам апякунскіх і прыёмных сем'яў, а выхаванцы дзіцячых дамоў сямейнага тыпу атрымлівалі не больш за 50% належнай пенсіі. Пры гэтым дзіцячы дом сямейнага тыпу, таксама як і апякунская і прыёмная сям'я, з'яўляецца сямейнай формай уладкавання на выхаванне дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі.

У прэс-службе галоўнага адукацыйнага ведамства паведамілі, што Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 ліпеня 2006 года №840 устаноўлены аднолькавыя грашовыя нормы на харчаванне, а таксама на забеспячэнне дзяцей-сірот адзеннем, абуткам, мяккім інвентаром і абсталяваннем, навучальнымі прыладамі, прадметамі асабістай гігіены і іншымі прадметамі першай неабходнасці. Таксама для дзяцей ва ўсіх формах сямейнага ўладкавання дзейнічаюць аднолькавыя грашовыя нормы на асабістыя расходы па дасягненні імі ўзросту 7 гадоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### КРЭДЫТНЫЯ ШЛЮЗЫ АДКРЫЛІСЯ?

**Найбуйнейшы банк краіны з другой паловы лютага аднаўляе выдачу крэдытаў фізічным асобам, як зазначана ў паведамленні на сайце Беларусбанка.**

У прэс-службе фінансавай установы адзначылі, што падобнае аднаўленне тычыцца ўсіх відаў крэдытаў на ўмовах, вызначаных банкам, а таксама па дзейнасці авердрафтных крэдытаў. Цяпер працэнтныя стаўкі па новых крэдытных дагаворах на спажывецкія патрэбы складаюць ад 50% гадавых па крэдытах тэрмінам да 1 года і да 55% гадавых па крэдытах тэрмінам да 5 гадоў.

Працэнтная стаўка па крэдытах на фінансаванне нерухомасці прапануецца на ўмовах, вызначаных банкам, і складае 35% гадавых. Нагадаем, што падобныя крэдыты выдаюцца насельніцтву па двух напрамках: на куплю жылля і на яго будаўніцтва. Па першым накірунку існуе адно важнае абмежаванне — сёння такі крэдыт выдаецца толькі на набыццё жылых памяшканняў, якія пабудаваны па дзяржаўным заказе. А вось крэдытаванне будаўніцтва жылля гэтых мэтавых абмежаванняў не мае. Такі крэдыт выдаецца пад любое будаўніцтва жылля (у тым ліку камерцыйнае) тэрмінам на 15 гадоў.

Адзінай абмежавальнай умовай з'яўляецца памер крэдыту, які выдаецца ў аб'ёме да 75% кошту будаўніцтва і ў межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка. Такім чынам, у сярэднестатыстычнага работніка памер крэдыту на фінансаванне нерухомасці атрымліваецца не вельмі вялікім, бо механізм закладу маёмасці і паручыцельства тут не выкарыстоўваецца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ШЧУПАКУ ПАТРЭБЕН СПАКОЙ

**Згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, з 1 сакавіка па 15 красавіка (у Віцебскай вобласці — з 9 сакавіка па 25 красавіка) устанаўліваецца забарона на лоўлю звычайнага шчупака.**

— Пры з'яўленні талай вады рыба пачынае больш інтэнсіўна рухацца, карміцца і рыхтавацца да штогадовага нерасту. Першым на яго ідзе шчупак, які накіроўваецца супраць цячэння па рэках, каналах і, знайшоўшы прагрэтыя месцы, пачынае працэс размнажэння,— сказаў **старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім ВАРАБЕЙ.**— За здабычу шчупака ў забаронены час парушальнікі могуць прыцягвацца да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці ў залежнасці ад характару правапарушэння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### «АЙЦІШНІКІ» ПАЎДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ У«СЯМЕЙНЫМ КАПІТАЛЕ»

**Прапануецца павысіць стаўку падаходнага падатку і для работнікаў Парка высокіх тэхналогій (ПВТ).**

Аб гэтым гаворыцца ў падрыхтаваным праекце дэкрэта кіраўніка дзяржавы, якім прадугледжваецца павелічэнне стаўкі падаходнага падатку ў адносінах да даходаў, што атрымліваюцца фізічнымі асобамі ад рэзідэнтаў і нерэзідэнтаў ПВТ, а таксама памеру часткі прыбытку працаўнікоў парка, на які налічваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы.

Згодна з дакументам, павелічэнне стаўкі падаходнага падатку прадугледжваецца з 9 да 10 працэнтаў, а памер часткі прыбытку працаўнікоў ПВТ для налічэння абавязковых страхавых узносаў прапануецца павялічыць з аднаразовай да двухразовай велічыні сярэдняй заработнай платы работнікаў у краіне.

Такое павелічэнне стаўкі падаходнага падатку на 1% для гэтых катэгорый фізічных асоб абумоўлена неабходнасцю забеспячэння рэалізацыі нормаў Указа Прэзідэнта Беларусі ад 9 снежня 2014 года № 572 «Аб дадатковых мерах дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей», які прадугледжвае выплату сёлета з 1 студзеня «сямейнага капіталу» шматдзетным сем'ям, тлумачыць сітуацыю прэс-служба Міністэрства фінансаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

04 марта 2015 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 25.02.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200295903 Совет директоров.

# ШЧЫРА ПРА КУЛЬТУРУ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## БІБЛІЯТЭКІ І НОВАЯ ФОРМА

**Адразу некалькі пытанняў ад бібліятэкараў (Лідскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, бібліятэкі Навагрудскага гандлёва-эканамічнага каледжа і іншых крыніц) прыйшло на тэму заробку. «Чаму бібліятэкары атрымліваюць зарплату на ўзроўні прыбіральшчыцы?», «Ці плануецца ў бліжэйшы час перагледзець зарплату бібліятэчным работнікам?», «30 гадоў стажу — 2,6 мільёна рублёў. Мы, атрымліваецца, лайдакі?».**

Па словах Барыса Уладзіміравіча, Міністэрства культуры прапрацоўвае магчымасць павышэння заработнай платы работнікам культурна-асветных арганізацый, акрамя павышэння тарыфнай стаўкі першага разраду.

— У адпаведнасці з пастановай Мінпрацы «Аб мерах па ўдасканаленні ўмоў аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, што атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый», павышэнне заработнай платы ажыццяўляецца адначасова з павелічэннем памеру тарыфнай стаўкі першага разраду. А памер тарыфнай стаўкі першага разраду вызначаецца пастановай Савета Міністраў.

Пры ўмове заключэння кантракта ў кіраўніка арганізацыі ёсць права павышаць узровень заробку работнікаў на падставе Дэкрэта Прэзідэнта «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны» за кошт тарыфнай стаўкі, але не больш чым на 50%.

**З Гомельскай абласной бібліятэкі запыталіся наконт неабходнасці аднаўлення кніжных фондаў публічных бібліятэк на 5% штогадова.**

**— Выканаць гэты паказчык абласной бібліятэцы не падаецца магчымым. Фонд нашай бібліятэкі налічвае больш за мільён экзэмпляраў. Сёлета запланавана набыць 16 тысяч экзэмпляраў на суму 1,6 мільярда рублёў, што ў канцы года складзе прыкладна 1,5% аднаўлення фонду, а для дасягнення 5% аднаўляльнасці нам неабходна набыць больш за 51 тысячу экзэмпляраў на 14 мільярдаў рублёў ці спісаць амаль 2/3 фонду. Ці магчыма ўстанавіць паказчык па аднаўленні фондаў для абласных бібліятэк не вышэй за паўтара працэнта за год?**

— Гэтае пытанне ўзнікае ўжо не першы раз. Давайце для пачатку выканаем праграму, да яе заканчэння засталося не так шмат часу, а потым будзем пераглядаць гэтыя лічбы. Бібліятэчная справа, безумоўна, вельмі змяняецца, сёння ўжо 444 бібліятэкі працуюць як новыя аб'яднаныя структуры — таму лічбы, закладзеныя ў праграму культуры на 2011–2015 гады, неабходна пераглядаць. Гэтаму пытанню мы прысвяцім асобнае пасяджэнне калегіі, дзе будзе ўвогуле разглядацца бібліятэчная справа.

**— Канцэпцыя культуры на наступныя пяць гадоў прадугледжвае алічбоўку бібліятэчных фондаў — 10% да 2020 года. Мы разумеем, што гэта будзе спрыяць папаўненню бібліятэчных фондаў і іх захаванню. Але гэта патрабуе затрат, таму задача не зусім выканальная на ўзроўні вобласці. Фонды публічных бібліятэк рэспублікі ў большасці аднатыпныя, таму мы лічым мэтазгодным зрабіць адзін рэспубліканскі цэнтр па алічбоўцы дакументаў, які зможа забяспечыць бібліятэкі копіямі. Якой вы бачыце стратэгію па вырашэнні гэтай праблемы? (пытанне *ад Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі).***

— Вы сфармулявалі праблему і нават выйсце з яе. Рэспубліканскі цэнтр, які будзе займацца алічбоўкай традыцыйных формаў існавання кніг — гэта, на мой погляд, найбліжэйшая перспектыва. Нацыянальная бібліятэка займаецца гэтым пытаннем, і ў хуткім часе мы гэта вырашым.

**— Я ўжо даўно на гэтую тэму думаю… Мой бацька прывёз з фронту раны і кнігу вершаў «Братам-франтавікам» 1942 года выдання. А мы сёння закрываем бібліятэкі, трэба ж працівіцца гэтаму, знайсці выйсце. У горадзе шмат сродкаў камунікацыі, а што застанецца ў вёсках, калі яшчэ і бібліятэкі закрыць? Гэтая тэндэнцыя не прывядзе да павышэння ўзроўню культуры. (Пытанне ад чытача *з Дзяржынска.)***

— Гэтае пытанне хвалюе не толькі вас, а і Міністэрства культуры ў першую чаргу. Але вы ведаеце, якія ў нас адбываюцца працэсы: вясковае насельніцтва штогадова змяншаецца на 4%, культуролагі адзначаюць прыход веку візуальнай культуры, а кніжная культура адыходзіць на другі план.

Мы не проста так закрываем бібліятэкі — у лепшым выпадку аб'ядноўваем. Ужо існуе амаль 450 бібліятэк у новай форме. Ёсць аб'ектыўныя падставы для скарачэння і гэтыя працэсы ісці будуць. Галоўнае, для нас не падыходзіць адназначна «скарачаць — значыць скарачаць». І памятайце аб магчымасцях нашых структур сувязі, інтэрнэт даводзяць да самага аддаленага кутка краіны. А калі не хапае інтэрнэту, радыё, ёсць перасоўныя бібліятэкі.

## ГРАМАДСКАЕ І АСАБІСТАЕ

**— Якія мерапрыемствы плануе Міністэрства культуры ў сувязі з 200-гадовым юбілеем выдатнага кампазітара Станіслава Манюшкі, што чакае нас у 2019 годзе? Ці плануецца стварэнне юбілейнага камітэта, распрацоўка дзяржаўнай праграмы мерапрыемстваў — якіх менавіта? Часу засталося не так шмат. Спробы запусціць падрыхтоўку да годнай сустрэчы юбілею пачаліся год таму, але пакуль што нічога рэальнага нават не запланавана. Ці будзе адноўлена сядзіба ва Убелі, на якую нават знайшліся фундатарскія сродкі? Ці ўстановяць помнік у Верхнім горадзе, за які летась было сабрана больш за 4000 подпісаў? (Алесь Белы, ініцыятар збору подпісаў за ўсталяванне помніка.)**

— Праграма, вядома ж, плануецца. Цяпер удакладняецца план урачыстых і памятных мерапрыемстваў, добраўпарадкавання аб'ектаў, звязаных з дзейнасцю кампазітара.

Будзе створана манументальная скульптура «Жыхары Мінска XIX стагоддзя: кампазітар Станіслаў Манюшка і драматург Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч — стваральнікі беларускай нацыянальнай класічнай оперы», якая будзе ўсталявана ў скверы на плошчы Свабоды ў Мінску. Але рэалізацыя праекта пачнецца толькі пасля ўзгаднення з кіраўніком дзяржавы.

Акрамя таго, бюст Станіслава Манюшкі ўжо быў усталяваны ў 2013 годзе на радзіме кампазітара ў вёсцы Убель Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці.

Мы плануем правесці цэлы шэраг тэматычных літаратурна-мастацкіх, дакументальна-публіцыстычных і іншых праграм, правесці міжнародную канферэнцыю, мастацкія выставы сучасных твораў, выдаць паштовую марку, выпусціць юбілейную манету з выявай Манюшкі, выдаць музычную спадчыну кампазітара і іншае. Урачыстыя мерапрыемствы пройдуць на Ратушнай плошчы ў Мінску, ва ўстановах культуры і адукацыі рэспублікі.

Ужо сёлета мы завяршым фарміраванне складу арганізацыйнага камітэта і план асноўных мерапрыемстваў.

**— Ці будуць адноўленыя рэспубліканскія фестывалі кшталту «Сузор'е дзяцінства», ці іншыя, дзе мы маглі б атрымаць уяўленне пра тое, што адбываецца ў развіцці дзіцячай творчасці ў розных абласцях нашай краіны? Бо існуючы конкурс «Я спяваю» такога ўяўлення не дае. (Пытанне *з Віцебска.)***

— Напэўна, маецца на ўвазе тэлевізійны конкурс «Сузор'е надзей».

Гэта быў аўтарскі праект Ніны Шобы на Першым нацыянальным тэлеканале. Яго поспех забяспечваўся ўдзелам Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі і Белтэлерадыёкампаніі. Апошні раз праект быў рэалізаваны ў 2006 годзе, але на тэлебачанні яшчэ амаль два гады ішла трансляцыя яго частак. Ён спыніў сваю дзейнасць, таму што з тэлебачання пайшла яго кіраўніца і аўтарка.

Мэтай «Сузор'я надзей» была дэманстрацыя талентаў і дасягненняў дзіцячых калектываў і выканаўцаў з усіх рэгіёнаў краіны. А «Я спяваю» — гэта яскравае захапляльнае тэлевізійнае шоу. Таму і не дае ўяўлення аб развіцці дзіцячай творчасці. Але гэта прадугледжана канцэпцыяй самога праекта, якая належыць Белтэлерадыёкампаніі.

Сярод мерапрыемстваў Міністэрства культуры, якія дэманструюць дасягненні дзіцячай мастацкай творчасці ў Беларусі, можна назваць міжнародны фестываль «Залатая пчолка» (праводзіцца штогод у Клімавічах), міжнародны фестываль «Зямля пад белымі крыламі» (праходзіць раз на 2 гады ў Мазыры), конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні «Халі-Хало» (штогод праходзіць у Наваполацку), фестываль дзіцячага і юнацкага фальклорнага мастацтва «Берагіня» (раз на 2 гады ў пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці), калядны фестываль дзіцяча-юнацкай творчасці «Мы — разам» (штогод у Брэсце), фестываль дзіцячых міжнародных аб'яднанняў Беларусі, Расіі і Украіны «Жывая вада дружбы», які праходзіць раз на 2 гады ў Гомелі.

**— Сёння на пасады галоўных рэжысёраў тэатраў (оперы і балета, музычны) запрашаюцца рэжысёры з-за межаў краіны. Чаму мы так збяднелі? У нас што, прапалі свае майстры сцэны? Тады дазвольце запытаць, чым займаецца Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, якая не ў сілах падрыхтаваць высокапрафесійнага тэатральнага рэжысёра? Можа, на факультэце тэатральнай рэжысуры неабходна правесці люстрацыю (не пабаюся гэтага слова!) кадраў і папоўніць яе нармальнымі і талковымі выкладчыкамі? *(З Мінска.)***

— Запрашэнне рэжысёраў з замежжа — традыцыйная сусветная практыка тэатральнага мастацтва. Кожны рэжысёр мае ўласныя мастацкія асаблівасці, а калі рэпертуар тэатра складаецца са спектакляў аднаго рэжысёра — гэта яго збядняе і спараджае выкарыстанне штампаў. Спектаклі ж запрошаных рэжысёраў могуць узбагаціць рэпертуар новай мастацкай стылістыкай, дазваляюць тэатральным трупам выкарыстоўваць свой патэнцыял у поўнай ступені, садзейнічаюць развіццю айчыннага тэатральнага мастацтва.

Што тычыцца двух названых тэатраў, тут склаліся творчыя тандэмы дзеячаў з Беларусі і Расіі. Галоўным рэжысёрам Вялікага тэатра оперы і балета з'яўляецца Міхаіл Панджавідзэ (грамадзянін Расійскай Федэрацыі), мастацкае кіраўніцтва балета тэатра ўзначальвае Юрый Траян (грамадзянін Рэспублікі Беларусь).

У акадэмічным музычным тэатры мастацкім кіраўніком працуе заслужаны работнік культуры Беларусі Адам Мурзіч (грамадзянін Рэспублікі Беларусь), галоўным рэжысёрам — ураджэнец Беларусі Міхаіл Кавальчык, які ў 1971 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут і ў розныя гады працаваў у тэатрах Беларусі.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шыльда на доме ў вёсцы Малая Багацькаўка Мсціслаўскага раёна.

Мастацкае кіраўніцтва драматычных тэатраў Беларусі таксама ўзначальваюць беларускія рэжысёры.

**— Я хачу задаць пытанне наконт Закона аб пахаваннях і пахавальнай справе. Я лічу, што гэта ў кампетэнцыі Міністэрства культуры. Трэба стварыць на могілках мемарыяльныя зоны, выдзеліць месца старадаўніх пахаванняў. (Чытач *з Магілёва.)***

— Міністэрства культуры вырашае пытанні захавання мясцін гістарычных пахаванняў і стварэння мемарыяльных зон. Вядома, што да іх адносяцца як старажытныя могілкі, так і пахаванні ахвяр войнаў. Такім аб'ектам надаецца асаблівы статус, і яны ўключаюцца ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Сёння ў Дзяржспіс унесены 783 воінскія пахаванні, 80 могілак, з якіх 73 — вайсковыя, 7 старадаўніх цывільных могілак. Гэта складае 66% ад агульнай колькасці помнікаў гісторыі, адзначаных у названым спісе.

Акрамя таго, ГА «Беларускі камітэт ІКАМОС» стварыў сайт www.niekropali.by, прысвечаны старадаўнім некропалям Беларусі. Тут збіраецца інфармацыя пра гістарычныя могілкі і складаецца база звестак гістарычных пахаванняў. З такіх аб'ектаў фарміруюцца прапановы аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці месцам пахаванняў, якія маюць выдатныя гістарычныя і мастацкія асаблівасці.

У 2012—2014 гадах Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры надала статус гісторыка-культурнай каштоўнасці яшчэ чатыром старажытным могілкам. Гэта Трышынскія могілкі (XIX стагоддзе) у Брэсце, могілкі нямецка-аўстрыйскіх салдат Першай сусветнай вайны ў вёсцы Няхачава Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці, магілы паўстанцаў (1863 года) у вёсцы Плябань Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці і ў Косаве Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Умяшанне ў такія аб'екты павінна быць вельмі карэктным, каб не страціць іх гістарычную самабытнасць, не нанесці шкоду новаўвядзеннямі. Таму стварэнне мемарыяльных зон ажыццяўляецца сумесна з Акадэміяй навук, мясцовымі ўладамі, мастакамі і грамадскасцю.

**— Мяне хвалюе, як будзе ўшанавана памяць Максіма Гарэцкага на яго радзіме? Быў знесены дом, дзе ён жыў. Абяцалі, што паставяць помнік пісьменніку, але дагэтуль нічога няма.**

— У вёсцы Багацькаўка (на радзіме пісьменніка) створаны музей імя Гарэцкага. У яго гонар названая бібліятэка ў Горках, вуліцы ў Мінску, Мсціславе і тых жа Горках. Устаноўлены помнікі ў Мінску і Вязьме, мемарыяльныя дошкі ў Горках і Мінску. У Вязьме ўстаноўлены памятны знак на меркаваным месцы пахавання пісьменніка.

Акрамя таго, мемарыяльная дошка Гарэцкаму ўстаноўлена ў Вільнюсе на будынку былой Віленскай беларускай гімназіі.

У 2012 годзе ад Горацкага райвыканкама мы атрымалі інфармацыю аб тым, што да 120-годдзя Максіма Гарэцкага плануецца ўстаноўка на месцы знесенага дома памятнага знака або помніка.

Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры падтрымала гэтую прапанову.

**— У Беларусі, можна сказаць, няма сваёй школы кінакрытыкі, літаратурнай крытыкі. Як вы думаеце, гэта добра ці дрэнна, калі крытыка ў краіне не адыгрывае значнай ролі ў творчым працэсе?**

— У нас ёсць саюз крытыкаў. Сёння той жа інстытут журналістыкі рыхтуе спецыялістаў. Крытыкам нельга нарадзіцца, гэта павінна быць сацыяльная інстытуцыя, у якой працуюць самыя розныя людзі — і журналісты, і нежурналісты. Неабавязкова мець адукацыю ВГІКа — я яе не маю, але заўсёды цікавіўся кінематографам на крыху філасофскім узроўні, быў у ліку беларускіх крытыкаў.

Але сапраўды нам проста не хапае мастацкай «цэнзуры» як ацэнкі якасці. Крытыка павінна быць актыўнай. Яе нам нестае і ў кінематографе, і ў тэатры, і ў літаратуры.

**— Станькава, вы ведаеце, — гістарычнае месца, шмат захавалася ад роду Чапскіх. Адразу скажу, тут шмат зроблена, дзяржава дапамагла адрэстаўраваць царкву і астатняе, але я хацела запытацца, што ў Станькаве плануецца зрабіць яшчэ? (Пытанне ад чытача *са Станькава.)***

— Па праграме «Культура Беларусі» за кошт абласнога бюджэту па будынку скарбніцы, які ўваходзіць у склад ансамбля былой сядзібы ў Станькаве, выканана адстройванне цаглянага скляпення ў падвальным памяшканні, пакладзена тратуарная плітка на прылеглай тэрыторыі.

У мінулым годзе міністэрства ўзгадніла праект па рэстаўрацыі альтанкі на востраве Радасці. Заказчыкам стаў «Піўзавод Аліварыя», а выканаўцам — індывідуальны прадпрымальнік. Ужо праведзены падрыхтоўчыя работы, рэстаўрацыя муроўкі калон, выраблены новы купал. Сёлета за кошт сродкаў заказчыка рэстаўрацыйныя работы на будынку альтанкі будуць прадоўжаны; акрамя гэтага, запланавана правесці рамонт мастка на востраў і расчыстку рэчышча.

**— Я хацела б задаць пытанне, можа быць, неардынарнае, а можа быць, вы ўжо на яго адказвалі. Мы ведаем Барыса Святлова як міністра культуры, а які Барыс Уладзіміравіч у жыцці, побыце? Ці любіце вы, напрыклад, выязджаць на прыроду, збіраць грыбы... (Званок *з Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў.)***

— Вы ведаеце, міністэрская работа займае большую частку часу. Вас, мабыць, цікавіць у першую чаргу, што я чытаю: скажу адразу, адну кнігу чытаць не атрымліваецца, таму зараз я чытаю зборнік беларускіх маладых аўтараў, кнігу па гісторыі Беларусі і яшчэ адну, якую мне падарыў расійскі мастацтвазнавец і крытык. Не буду ўжо казаць пра тую літаратуру, якую праглядаю кожны дзень у сувязі з працай. Кіно гляджу ў першую чаргу па неабходнасці: фільмы нашай кінастудыі ў якасці не проста гледача, але і чалавека, які іх ацэньвае. Што тычыцца музычнага і тэатральнага мастацтва — у мяне ёсць і неабходнасць, і магчымасць амаль кожны вечар быць на тым ці іншым мерапрыемстве. 99% часу — гэта мая праца, таму што так супадае.

Грыбы вельмі люблю збіраць, так. Я цяпер жыву за горадам, таму маю магчымасць некалькі гадзін знаходзіцца на прыродзе, хаця б у начны час. Таму грыбы — самі разумееце — збіраць не атрымліваецца, нягледзячы на тое, што ў тых мясцінах, дзе я жыву, летась быў сапраўдны грыбны бум.

«Прамую лінію» правяла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

## РОДНАЯ МОВА — КЛОПАТ ДЛЯ ЎСІХ

**— У нас на Магілёўшчыне шыльды на прыпынках, назвы новых вуліц напісаны пераважна на рускай мове, нават назвы станцый у цягніках гучаць па-руску. Чаму ўстановы культуры не спрыяюць беларусізацыі? Прапаную, каб у цягніках 50% музыкі гучала на беларускай мове, а ўжо ўсё астатняе — на рускай ці англійскай. (Чытач *з Магілёва.)***

— Ніхто пэўных падлікаў не праводзіў — які працэнт шыльдаў на беларускай мове. Я даволі часта наведваю Магілёў і ўсходнюю частку нашай краіны — шчыра кажучы, не заўважыў, каб там адбывалася русіфікацыя. На мой погляд, такія суадносіны беларускай і рускай мовы гістарычна склаліся на ўсходзе краіны. Вы прапаноўваеце зрабіць пэўны працэнт беларускіх песень у цягніках — калі ласка, можна зрабіць, гэта не так і цяжка. Галоўнае, каб была ў гэтым патрэба. Але я заўважыў, што ў нашых фірмовых цягніках да Масквы беларуская мова ўжываецца не на 50%, а на ўсе 100.

Закранаючы пытанне пра шыльды на рускай мове, міністр нагадаў, што каардынацыю дзейнасці па прысваенні найменняў геаграфічным аб'ектам і іх перайменаванні ажыццяўляе тапанімічная камісія пры Савеце Міністраў.

**— Культура — усеабдымнае паняцце. У першую чаргу яно азначае любоў да сваёй Радзімы, гісторыі, нацыянальных традыцый. Дапамагаць у выхаванні могуць веданне сімвалаў дзяржаўнасці — герба, сцяга і гімна, а таксама павага і гонар за родную мову...**

**Але перыёдыку на роднай мове не выпісваюць многія бібліятэкі, тым больш дзяржаўныя ўстановы, вайсковыя падраздзяленні. Наш сцяг рэдка дзе ўбачыш каля ўваходу ў будынак дзяржустаноў, нават органаў сілавых структур. Чаму так адбываецца? (Пытанне *з Віцебска.)***

— Падпіска для бібліятэк абавязкова ўключае акрамя абласных і раённых газет, вядучыя беларускія выданні. І ўстановы культуры выпісваюць галіновыя выданні — газету «Культура» і часопіс «Мастацтва». Стэнды з выявай дзяржаўных герба, сцяга і тэкстам гімна таксама сустракаюцца паўсюдна.

Пераважная колькасць мерапрыемстваў у нашых клубных установах, бібліятэках і музеях праводзіцца на беларускай мове. Фестывалі і выстаўкі народнай творчасці і фальклору — выключна беларускамоўныя. У нас створана больш за сотню дамоў і цэнтраў рамёстваў, працуе Беларускі саюз майстроў народнай творчасці. Рэпертуар Купалаўскага тэатра беларускамоўны, у праграме астатніх — да 80% твораў беларускіх аўтараў.

Таму можна сказаць, што мы падтрымліваем і папулярызуем беларускую мову, прычым па шматлікіх кірунках.

**— Куды ў абласных драматычных тэатрах падзеліся спектаклі на беларускай мове? Наколькі вядома, раней міністр культуры зацвярджаў план пяці новых пастановак, і без такога спектакля вяртаў план на дапрацоўку. Чаму сёння няма такога? Што вы думаеце рабіць, каб захаваць беларускамоўныя спектаклі? *(З Мінска.)***

— Беларускія тэатры ўвогуле актыўна прапагандуюць беларускую мову, і Міністэрства культуры падтрымлівае беларускіх драматургаў, кампазітараў, паэтаў-песеннікаў. Тэатры, цыркі, канцэртныя ўстановы ў першую чаргу выкарыстоўваюць творы беларускіх аўтараў, у тым ліку на беларускай мове. Цалкам беларускамоўныя Купалаўскі тэатр, тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску, віцебскі тэатр «Лялька», Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача і іншыя.

Да 70% бягучых рэпертуараў складаюць творы беларускіх аўтараў на беларускай мове. Напрыклад, у Слонімскім драматычным тэатры такіх 18 спектакляў, у Мінскім абласным тэатры лялек «Батлейка» — 20. І штогод з'яўляюцца новыя пастаноўкі на беларускай мове.

...на рускай мове.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## БУДУЧЫНЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА КІНО

**— Выйшаў зборнік анімацыйных фільмаў кінастудыі «Беларусьфільм». Прапаную выпусціць дыск с серыяй фільмаў пра беларускую геральдзіку «Аповесць мінулых гадоў» і дыск экранізацый Уладзіміра Караткевіча. Сюды можа ўвайсці, напрыклад, мультфільм «Каму чорт дзетак калыша». (Прапанова ад чытача *з Магілёва.)***

— Добрая прапанова, слушная. Я агучу яе кіраўніцтву кінастудыі «Беларусьфільм», і паглядзім, якія можна знайсці грошы для гэтага праекта. Дзякуй за падказку.

**— У нас кожны год выпускаюцца маладыя спецыялісты з Акадэміі мастацтваў і Універсітэта культуры. Куды яны трапляюць? Дзе новыя фільмы, чаму на «Беларусьфільме» іх выходзіць так мала? Не чуваць новых імёнаў, назваў карцін. Хочацца, каб іх выходзіла больш, каб было чым ганарыцца.**

— Можна паспрачацца, шмат ці не выходзіць фільмаў. Калі вас цікавяць лічбы, то за мінулы, 2014-ы, год у нас было створана 7 ігравых, 7 анімацыйных фільмаў, 14 неігравых і 40 летапісных матэрыялаў — гэта паказчыкі кінастудыі. Некаторае змяншэнне вытворчасці звязана з актыўнай рэканструкцыяй «Беларусьфільма». Сёння ў нас ёсць новы вытворчы будынак — два павільёны, у якіх ужо рыхтуецца шэраг фільмаў.

Кінематограф атрымлівае дзяржаўную падтрымку, як і раней, але ўжо на ўмовах конкурснага адбору, куды трапляе не толькі «Беларусьфільм».

Большасць маладых спецыялістаў ідзе працаваць на тэлебачанне, але некаторыя з іх асвойваюць і наш кінематограф, у тым ліку на нацыянальнай кінастудыі. Летась быў прэзентаваны фільм «Белыя росы. Вяртанне», ён якраз стаў дэбютам маладой выпускніцы Акадэміі мастацтваў.

**— Мне вядома, што, згодна з даручэннем Адміністрацыі Прэзідэнта, Міністэрства культуры разгледзела мой зварот па аказанні дзяржаўнай падтрымкі стварэнню поўнаметражнага дакументальнага фільма «Беларус. Невядомы Жукаў». Адміністрацыя Прэзідэнта падтрымлівае мой праект. А вы асабіста падтрымліваеце гэты фільм? (Рэжысёр Анатоль Іванавіч Алай.)**

— Безумоўна. Таму што, чым далей адыходзяць тыя гістарычныя падзеі, тым больш адкрываецца новых фактаў. Нягледзячы на тое, што існуе вялікі кінематаграфічны матэрыял, асоба Жукава даволі неадназначная, і лёс яе звязаны з Беларуссю. Таму я гэты праект падтрымліваю.

Мы абвясцілі конкурс кінапраектаў, калі ласка, няхай кінастудыя ўносіць свае прапановы. Мы не распісвалі дакладную тэматыку для дакументальных фільмаў. Можна лічыць, што тыя тэмы, якія мы прапісалі для ігравога кіно, таксама важныя для дакументальнага. Галоўнае, каб сюжэты не перасякаліся.

**— Ці правільна я разумею, што фінансавацца дзяржавай сёлета будуць толькі чатыры ігравыя і тры дакументальныя карціны? *(Ад рэдакцыі.)***

— Гэта так, але агульная лічба фінансавай падтрымкі кінематографа — каля 60 мільярдаў рублёў. Узнікала пытанне, чаму такі вялікі часавы разрыў паміж конкурсамі (апошні конкурс кінапраектаў праводзіўся ў 2012 годзе. — **Рэд.**). У 2013 годзе быў працяг конкурсу 2012-га. Пазіцыя «нацыянальны фільм» не была закрыта, таму быў запушчаны праект «Мы, браты». У гэтым годзе мы абвясцілі конкурс адразу ж, як убачылі рэальныя грошы, якія можам выдаткаваць на кіно. З тых сродкаў, якія былі нам дадзены, мы выкарысталі тыя 60 мільярдаў і абвясцілі першую палову конкурсу. Сюды не ўвайшло анімацыйнае кіно — для яго конкурс будзе праводзіцца пазней.

**— Ці могуць быць рэалізаваныя кінапраекты за бюджэтныя сродкі па-за межамі конкурсу?**

— У мінулыя гады кінастудыя мела свае грошы, на якія запускала праекты, ці ўваходзіла ў капрадукцыю сумесна з расійскімі кінематаграфістамі. Сёння, наколькі я ведаю, разглядаецца праект Эміра Кустурыцы, у які «Беларусьфільм» увойдзе прыватнымі грашыма.

Калі ў нас будзе магчымасць атрымаць дадатковыя грошы на кінематограф, мы абвясцім яшчэ адзін конкурс або працяг гэтага.

**— Ці ідзе гаворка пра дэбютны фільм?**

— Пакуль што не, але ў будучыні трэба звярнуць на яго ўвагу. Дадатковыя сродкі я ў першую чаргу аддаў бы на дэбют. Няхай, можа, гэта будзе некалькі навел у адным фільме.

**— Што прадугледжана на той выпадак, калі на нейкую намінацыю ўвогуле не будзе пададзена заявак?**

— Мы пераразмяркуем грошы, магчыма, увядзём новую намінацыю. Але калі мы прапісалі гэтыя тэмы — ведаем, што атрымаем нешта па кожнай з іх. Безумоўна, гэтыя тэмы дыктуе час, вы бачыце, што яны прывязаны да падзей года. Гэта добра разумеюць і нашы кінематаграфісты.



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Сацыяльны клопат

# ТОНКАСЦІ ГЕНДАРНАЙ ПАЛІТЫКІ

## Чаму заробак жанчын на чвэрць меншы за мужчынскі, а беларускіх татаў, што «сядзяць у дэкрэтным», толькі два працэнты?

**Паняцці «гендарная палітыка» і «барацьба за правы жанчын» многія беларусы лічаць сінонімамі. І ў чымсьці яны, безумоўна, маюць рацыю. Так здарылася, што гісторыя на працягу некалькіх тысячагоддзяў вызначала месца жанчыны на кухні з баршчом (ці што там раней гатавалі?) і дзіцем на руках. Не без выключэнняў, але гэта толькі пацвярджае існаванне правіла. Таму не дзіўна, што сёння столькі ўвагі надаецца прававому статусу менавіта жанчыны. Якія праблемы хвалююць беларускую гендарную палітыку ў апошнія гады і ці патрэбны нам закон аб гендарнай роўнасці?**

### АГРЭСАРАЎ ВЫСЯЛЯЕМ

У аддзеле народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны адзначаюць, што сёння шмат сіл накіравана на аказанне дапамогі тым, хто пацярпеў ад хатняга гвалту.

— Летась у межах закона «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў» уведзена навацыя — ахоўнае прадпісанне, на падставе якога агрэсара могуць выселіць з кватэры і ўвогуле забараніць яму набліжацца да ахвяры. Гэта важнае рашэнне, паколькі дагэтуль мы працавалі толькі з ахвярай, якой звычайна становіцца жанчына з дзецьмі. Мы маглі ёй даць прытулак, але ж тады трэба мяняць садок, школу, месца працы. Вялікі дыскамфорт для сям'і, — каментуе **галоўны спецыяліст аддзела Алена КОМЛІК.**

За мінулыя два гады колькасць «крызісных» пакояў, дзе жанчыны могуць схавацца ад прыступаў лютасці сваіх выбраннікаў, павялічылася ў два разы (да 105 памяшканняў у студзені 2015-га). У Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях прытулкі адкрыты ва ўсіх раёнах. Пры неабходнасці пацярпелых забяспечваюць бясплатным харчаваннем. Знялі лімітавы тэрмін пражывання ў пакоі, які раней складаў 10 дзён. На колькі жанчына можа там застацца, цяпер залежыць ад канкрэтнай сітуацыі.

Важным напрамкам гендарнай палітыкі ў апошнія некалькі гадоў было пытанне жаночага беспрацоўя. У праграме занятасці нават асобным пунктам вылучалася занятасць жанчын. Для іх праводзілі спецыяльныя кірмашы вакансій і «дні прадпрыемстваў», навучалі новым спецыяльнасцям, што карыстаюцца попытам і даюць магчымасць арганізаваць свой бізнес. Летась 35 працэнтаў ад агульнай колькасці беспрацоўных, якіх накіравалі на прафесійную падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі, склалі жанчыны. Амаль 400 з іх вывучалі асновы прадпрымальніцкай дзейнасці. Дзякуючы гэтым мерам, скараціўся прамежак часу, калі жанчына стаіць на ўліку ў аддзеле занятасці. Каб знайсці працу, сярэднестатыстычнай прадстаўніцы прыгожага полу сёння патрэбны 1,7 месяца (у 2012-м, напрыклад, гэты тэрмін складаў 1,9 месяца), а працягласць жаночага беспрацоўя паменшылася да 3,3 месяца.

### ЗАРОБАК ЗАЛЕЖЫЦЬ НЕ АД ПОЛУ, А АД МЕСЦА ПРАЦЫ

Закона аб гендарнай роўнасці ў нашай краіне пакуль няма. А ці патрэбны ён?

— Мы прапрацоўвалі гэтае пытанне, — кажа Алена Міхайлаўна. — У краіне ўпершыню была праведзена гендарная экспертыза заканадаўства: наколькі яно адпавядае Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын. Дыскрымінуючых нормаў у нас нідзе не ўтрымліваецца. Лепш, напэўна, удасканальваць дзейнае заканадаўства, чым прымаць асобны дакумент. Тым больш у шэрагу краін ён меў хутчэй рамкавы характар. Сёння ва ўсіх беларусаў роўныя правы і магчымасці. Іншая справа, як мужчыны і жанчыны іх рэалізуюць.

З рэалізацыяй, сапраўды, не ўсё так проста. Напрыклад, заработная плата беларускіх жанчын складае толькі 74 працэнты ад таго, што атрымліваюць мужчыны. Але не таму, што за аднолькавую працу ў залежнасці ад полу плацяць розныя грошы. У той час, калі палова мужчын заняты ў прамысловасці і будаўніцтве, дзе заробкі традыцыйна вышэйшыя, большасць жанчын (65 працэнтаў) задзейнічаны ў сферы паслуг. Такія галіны, як гандаль, гасцінічны і рэстаранны бізнес, фінансавая дзейнасць прыкладна на 70 працэнтаў прадстаўлены дзяўчатамі. Сярод супрацоўнікаў устаноў адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнай абароны жанчын і ўвогуле больш за 80 працэнтаў. Ды і на месцах кіраўнікоў сярэдняга і высокага ўзроўню, незалежна ад віду эканамічнай дзейнасці, часцей апынаюцца мужчыны.

Фактычна выбар месца працы нічым не абмежаваны, аднак перайсці ў іншую сферу ці заняць адказную пасаду замінаюць, як ні дзіўна, стэрэатыпы.

— Жанчыны прывыклі, што на іх двайная нагрузка: і на працы, і дома трэба ўсё паспець, — мяркуе Алена Міхайлаўна. — Нягледзячы на высокі ўзровень занятасці (у агульнай колькасці працуючых удзельная вага жанчын складае амаль 55 працэнтаў), яны ў дадатак гатуюць ежу, прыбіраюць у кватэры, рыхтуюць з дзецьмі дамашняе заданне, удзельнічаюць у бацькоўскіх сходах. У выніку сукупная нагрузка — прафесійныя і сямейныя абавязкі — значна большая, чым у мужчын. Таму жанчыны не заўсёды маюць жаданне займаць высокія пасады. Аднак трэба сказаць, што Беларусь уваходзіць у 27 краін свету, якія дасягнулі мэтавага паказчыка па ўдзеле жанчын у дзяржаўным кіраванні. Сёння Нацыянальны сход на трэць прадстаўлены жанчынамі.

### ТАТА Ў ДЭКРЭТНЫМ ВОДПУСКУ — ПАКУЛЬ РЭДКАСЦЬ

У тэорыі магчымасць займацца хатнімі справамі і выхаваннем малых не абумоўлена полам. Аднак ці гатовы мужчыны сядзець з дзецьмі, пакуль жанчына будзе зарабляць грошы і рабіць кар'еру? Па статыстыцы, толькі два працэнты беларускіх татаў згаджаюцца пайсці ў дэкрэтны водпуск.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Водпуск па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў па жаданні сям'і прадастаўляецца, замест маці, бацьку ці іншаму сваяку, — кажа Алена Міхайлаўна. — Так, у 2013 годзе гэтым правам скарысталіся 48 дзядуляў, 544 бабулі і 2 731 тата. Колькасць мужчын у дэкрэтным штогод расце. У той жа Швецыі нават заахвочваюць татаў браць такі водпуск. Там устаноўлены пэўны перыяд, падчас якога толькі мужчына можа даглядаць дзіця ці сям'я ўвогуле згубіць гэтыя некалькі месяцаў.

Каб узмацніць ролю бацькі ў сям'і, на базе Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей ужо некалькі гадоў рэалізуецца праект «Тата-школа», дзе расказваюць, як сумесна выхоўваць малых. А ў БДУ «Школа ўсвядомленага бацькоўства» вучыць студэнтаў размяркоўваць хатнія абавязкі.

Грамадства да падобных ініцыятыў часам ставіцца скептычна. Маўляў, не сядзіцца жанчынам на месцы. Хм... Розныя мадэлі паводзінаў, якія гендарная палітыка актыўна прапагандуе, у інтарэсах не толькі жанчын. Абстрактныя абмежаванні на ўзроўні стэрэатыпаў выклікаюць цалкам рэальныя праблемы. Меркаванне пра тое, што мужчыне не трэба бегаць у паліклініку па дробязях і сядзець з талонам да ўрача, не найлепшым чынам адбілася на здароўі мужчынскай часткі насельніцтва. Паводле ацэнкі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, натуральнай розніцай у працягласці жыцця жанчын і мужчын прынята лічыць 5 гадоў. У нашай краіне гэтая розніца перавышае норму ў два разы. Таму пытанні мужчынскага здароўя ўжо плануюць уключыць у наступны Нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці. Хоць змяніць стэрэатыпныя ўстаноўкі будзе складаней, чым заканадаўства.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Дзённік настаўніка

# Людзі без будучыні



**«Дзеці — нашая будучыня!» Гэты крылаты выраз, вядома ж, ведаюць усе. Але, на жаль, не ўсе могуць мець дзяцей... і гэта вялікая трагедыя многіх сямейных пар, а часам менавіта з гэтай прычыны і распадаюцца шлюбы. Сёння, праўда, медыцына дасягнула значных поспехаў у вырашэнні праблемы, ды і, у рэшце рэшт, бяздзетныя пары могуць усынавіць малога, бацькі якога альбо памерлі, альбо судовым рашэннем пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Менавіта такім чынам дзеці-сіроты знаходзяць сабе новых маму і тату, а шчаслівыя дарослыя становяцца сапраўднымі бацькамі для сваіх прыёмных дзетак.**

На жаль, тут таксама не абыходзіцца без праблем, але я зараз зусім пра іншае. Пра тых дарослых, якія проста не жадаюць мець дзяцей.

Якая іронія лёсу! Хтосьці так марыць аб дзетках... і ўсё дарэмна! А тут самі не жадаюць...

Пытанне: чаму?

Бывае, што маладая пара проста адкладвае нараджэнне нашчадкаў на больш позні тэрмін, а пакуль хоча проста пажыць для сябе. І часта здараецца так, што гэтае адкладванне зацягваецца настолькі, што потым аказваецца: позна ўжо штосьці змяняць у такім размераным і наладжаным жыццёвым укладзе... ды і страшнавата гэта рабіць! І дажываюць такія муж з жонкай свой век у адзіноце, заводзяць сабе пакаёвых сабачак, коцікаў ці папугайчыкаў. Клапоцяцца аб іх, размаўляюць з імі па вечарах... а маёмасць перапісваюць на пляменнікаў ці якіх іншых родзічаў, каб толькі не забываліся, каб наведваліся хоць зрэдку...

Шкада мне такіх старых, хоць і разумею: самі ва ўсім вінаватыя! І зноў-такі, не пра іх размова.

А пра тых, хто не проста не жадае мець дзяцей, але і стварылі з гэтага свайго нежадання цэлую ідэалогію. Я маю на ўвазе так званы рух «чайлдфры».

У перакладзе з англійскай мовы гэтае слова азначае «свабодны ад дзяцей». Асноўнай ідэяй з'яўляецца асэнсаванае нежаданне заводзіць дзяцей у імя асабістай свабоды.

Само слова «чайлдфры» ўзнікла ў ЗША яшчэ ў 70-я гады мінулага стагоддзя з падачы цяпер ужо не існуючай «Нацыянальнай Арганізацыі для Не-Бацькоў ЗША». Назва даволі гучная, але арганізацыя праіснавала нядоўга і хутка распалася.

А вось слова «чайлдфры» не знікла разам з ёю. У 1990-я гады амерыканка Лэслі Лафает сфарміравала адну з першых сучасных груп чайлдфры... А сёння ў адных толькі Злучаных Штатах існуе больш за 40 такіх арганізацый, і ў кожнай з іх — тысячы ўдзельнікаў. І колькасць іх усё павялічваецца... Згодна з даследаваннем амерыканскага Нацыянальнага цэнтра статыстыкі аховы здароўя, штогод працэнт амерыканак, якія наогул не жадаюць мець дзяцей, павялічваецца на чвэрць. Зыходзячы з іншых даследаванняў гэтага ж цэнтра, доля амерыканскіх жанчын дзетароднага ўзросту, якія самі сябе вызначаюць як «добраахвотна бяздзетныя», узрасла з 2,4% у 1982 годзе да 6,6% у 1990-м. Цяпер гэта лічба, без усялякіх сумненняў, будзе яшчэ вышэйшай.

Але феномен «чайлдфры» сёння не абмяжоўваецца Злучанымі Штатамі. Ён даўно ўжо ахапіў Заходнюю Еўропу і не толькі яе. У Аўстраліі, напрыклад, яго прыхільнікі нават спрабуюць стварыць сваю палітычную партыю, якая б абараняла іх правы. Большасць з тых, хто прытрымліваецца прынцыпаў «чайлдфры», не проста адукаваныя, а высокаадукаваныя людзі. І даволі забяспечаныя, да ўсяго іншага...

— Я свабодны чалавек і раблю, што лічу для сябе патрэбным! — у адказ на крытыку нязменна адказваюць прыхільнікі руху «чайлдфры». — Ніякіх законаў я не парушаю: проста не жадаю мець дзяцей! Калі камусьці такое не падабаецца — гэта іх асабістая справа.

І з гэтым цяжка спрачацца. Сапраўды, аніякіх законаў прыхільнікі «чайлдфры» не парушаюць, тым больш што рух «чайлдфры» — не адзіны ў сваім імкненні наблізіць канец чалавецтва. Ёсць і іншыя. Напрыклад, так званы «Рух за добраахвотнае знікненне чалавецтва», больш вядомы як VHEMT (ад англ. Voluntary Human Extinction Movement), — грамадскі экалагічны рух, галоўнай мэтай якога з'яўляецца... добраахвотнае выміранне чалавецтва. Не, рух гэты не прапагандуе забойствы, самазабойствы, масавую стэрылізацыю і іншыя гвалтоўныя метады скарачэння народанасельніцтва. Проста прапануе адмовіцца ад далейшага размнажэння.

Не хацелася б мне быць удзельнікам гэтага руху...

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

Даты | Падзеі | Людзі

**21 ЛЮТАГА**

***Міжнародны дзень роднай мовы. Абвешчаны на 30-й Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў лістападзе 1999 года з мэтай садзейнічання моўнай і культурнай разнастайнасці і шматмоўю. Адзначаецца пад эгідай ЮНЕСКА штогод (з 2000-га). Ініцыятыва накіравана на прызнанне і заахвочванне выкарыстання родных моў, асабліва моў нацыянальных меншасцяў.***

**1296** год — нарадзіўся Альгерд, вялікі князь літоўскі. У 1318 годзе ён ажаніўся з віцебскай князёўнай Марыяй Яраслаўнай і стаў віцебскім князем. Паспяхова вёў палітыку, накіраваную на канчатковае аб'яднанне ўсходне-славянскіх земляў у адзінай дзяржаве. Да ВКЛ было далучана Чарнігава-Северскае княства, у палітычнай залежнасці ад яго апынулася і Смаленскае княства. Альгерд ажыццявіў тры паходы на Маскву. Шмат разоў узначальваў войскі для адпору агрэсіі Тэўтонскага ордэна. За час яго княжання тэрыторыя ВКЛ павялічылася больш чым у два разы, што было выгадна беларускім землям, бо забяспечвала ім вядучае месца ў дзяржаўным жыцці, садзейнічала развіццю эканомікі і культуры ВКЛ. Памёр Альгерд у 1377 годзе.



**1804** год — англійскі вынаходнік Рычард Трэвітык прадэманстраваў публіцы першую паравую павозку на рэйкавых пуцях — прататып сучаснага паравоза. Падчас выпрабаванняў 4-колавы паравоз цягнуў 6 вагонаў, у адным з якіх было 70 пасажыраў, з хуткасцю 8 км у гадзіну. Так пачыналася эра чыгуначнага транспарту.

**1920** год — 95 гадоў таму Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Прэзідыум Вышэйшага Савета Народнай Гаспадаркі прынялі рашэнне аб стварэнні Дзяржаўнай камісіі па электрыфікацыі Расіі (ГОЭЛРО). Канчаткова план ГОЭЛРО быў зацверджаны VII з'ездам Саветаў у снежні 1920 года.

Было сказана

**Гай Петроній Арбітр, старажытнарымскі пісьменнік, І ст.:**

*«Чаму б ты ні вучыўся, ты вучышся для сябе».*

■ Роднай мове прысвячаецца...

# РАСПЛЮШЧЫЦЬ ВОЧЫ І АДЧЫНІЦЬ АКНО...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Юныя аўтары часопіса «Бярозка», які выходзіць у Выдавецкім доме «Звязда», — не толькі рэальныя носьбіты роднай мовы, але і яе апекуны-заступнікі. Іначай не пісалі б яны пра яе вершы, эсэ і нават казкі. Зрэшты, пераканайцеся самі. Згадаўшы, што акурат сёння ў роднай мовы свята — яе дзень.**

❍ ❍ ❍

*Песня мілагучная*
*З вуснаў маіх зрываецца...*
*З вуснаў маіх зрываецца —*
*І ўсё ляціць, не спыняецца!*

*Словамі роднай мовы*
*Песня пераліваецца...*
*З вуснаў маіх зрываецца —*
*І ўсё ляціць, не спыняецца!*

**Дамінік МАЦУКЕВІЧ,**
**5 «А»клас, гімназія № 10, Мінск.**

### МОВА РОДНАЯ

*Песняй цудоўнай, свабоднаю,*
*Льецца мова мая родная!*
*Запаветны глыток вадзіцы,*
*З чыстай празрыстай крыніцы.*

*Як пачую яе — ганаруся,*
*Што жыву я ў сваёй Беларусі!*
*Песняй цудоўнай, свабоднаю,*
*Льецца мова мая родная!*

**Марыя КІРКЕВІЧ,**
**10 клас, СШ № 25, Мінск.**

### МОЎНЫЯ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ

Ці ёсць сярод вашых сяброў тыя, хто карыстаецца беларускай мовай штодзённа, а не толькі на школьных занятках? У мяне такія знаёмыя ёсць, і я доўгі час ім зайздросціў, бо думаў, што сам так не змагу. Але вырашыў: буду спрабаваць! Прынамсі, тыдзень буду размаўляць толькі па-беларуску!

Гонар падказваў: абяцанні трэба выконваць. У панядзелак зранку мо з паўгадзіны блытаўся ў словах, потым пайшло. Першымі, хто пачуў «новага мяне», былі бацькі. Яны не вельмі здзівіліся, бо дома я часам карыстаўся роднай мовай, але хвілін па пяць, не болей, пра што яны мне і нагадалі. І гэтыя іх словы сталі для мяне ўжо другім выклікам. Вера мая ў тое, што змагу, рабілася ўсё мацнейшай. У школе на кожным перапынку я размаўляў толькі па-беларуску, што, як і чакалася, выклікала ў маіх школьных сяброў розныя эмоцыі і ўражанні: адны падтрымалі — раблю, маўляў, добрую справу, іншыя, наадварот, глядзелі ў мой бок з нейкай непавагай, быццам я займаюся «паказухай» і хутка гэта скончыцца. Я радаваўся, што другіх аказалася значна меней.

Першай, хто ацаніў мой моўны эксперымент па-сапраўднаму, была настаўніца беларускай мовы. Яна здалёк пачула, як я размаўляю з сябрамі, і паддала мне яшчэ большай ахвоты працягваць гэтую справу. Так пачаўся тыдзень майго беларускамоўнага жыцця. На трэці дзень школьных сяброў было не здзівіць, хоць у горадзе я працягваў лавіць зацікаўленыя позіркі. Вялізныя здзіўленыя вочы прадаўцоў з супермаркета без смеху не магчыма згадваць. Некаторыя сябры і дзяўчына спрабавалі карыстацца беларускай мовай разам са мной, і хоць гэта ў іх часам не вельмі атрымлівалася, я ўдзячны ім нават за спробы.

Яшчэ ў першую ноч таго тыдня я пачаў думаць над прамежкавымі вынікамі свайго эксперымента. Можа, тыя хлопцы і дзяўчаты мелі рацыю: гэта «паказуха»? Але дакладна не з мэтай набыць танны аўтарытэт. Хутчэй, гэта «рэклама» беларускага ладу жыцця, у якім ніхто не цураецца роднай мовы і не здзіўляецца, пачуўшы яе. Я паказаў усім, каго сустрэў на тым тыдні, што калі я карыстаюся беларускай мовай, дык застаюся сучасным гарадскім хлопцам, а не раблюся якімсьці «простым» ці вяскоўцам. Скончыўшы эксперымент (які лепш назваць пераходам, бо я пабачыў, што магу, а раз магу, значыць, буду), я прыйшоў да сумнай высновы: шмат хто яшчэ лічыць, што беларуская мова жыве толькі ў беларускіх вёсачках, а ў гарадах ёй няма месца. На жаль, такія думкі наведваюць нават тых, хто шкадуе родную мову і мог бы за яе заступіцца, але чамусьці не робіць гэтага. Менавіта для такіх я і рабіў сваю справу, якая з цягам часу ператварылася ў лад майго жыцця. Я гавару на беларускай мове, прымаючы выклік асяроддзя, карыстаюся ёю цяпер, даючы прыклад іншым, і буду размаўляць далей — бо гэта мая родная мова, дык чаму б не?..

**Уладзіслаў ТРУХАНАЎ,**
**10 «А» клас, сярэдняя школа №1, Докшыцы.**

### АСАБОВЫ ЗАЙМЕННІК

У казачнай краіне Лінгвістыцы жыла-была чараўніца. Звалі яе Марфалогія. Разам са сваёй сястрой Фанетыкай яна кіравала гэтай краінай. Звычайна ўсе валадары вельмі адзінокія, хоць вакол іх і тоўпіцца незлічоная колькасць прыдворных, целаахоўнікаў, прыслугі ды і проста падхалімаў...

Марфалогіі таксама было б вельмі самотна, калі б не яе дзеці — часціны мовы. Кожная з іх мела свае абавязкі.

Самым старэйшым быў Назоўнік. Ён штодзень уставаў на досвітку і браўся за работу. Назоўнік вельмі ганарыўся тым, што амаль ніводны сказ не можа абысціся без яго, таму і задзіраў нос, лічачы сябе адметным, важнейшым за іншых. З гэтае прычыны ён часта сварыўся з братам Дзеясловам, які таксама пачуваў сябе самым-самым, лепшым нават за старэйшага брата.

Амаль кожны вечар Назоўнік і Дзеяслоў спрачаліся:

— Я галоўны, бо я абазначаю прадмет! — крычаў першы.

— А што твой прадмет без дзеяння? — распыляўся другі.

— Супакойся і ўзгадай, чыё дзеянне ты абазначаеш?

— І тым не менш я — галоўны, што б ты там сабе ні думаў! — лямантаваў Дзеяслоў.

Іншы раз браты нават за чубы хапаліся, і тады астатнія часціны мовы расцягвалі іх у розныя бакі.

Трэці брат, Прыметнік, у спрэчку старэйшых не ўступаў, жыў ціха, у згодзе з Назоўнікам, пабойваўся і недалюбліваў Дзеяслова, таму ніколі не меў з ім аніякіх спраў. Прыметнік аддана абазначаў прыкметы назоўніка і быў вельмі задаволены сваім жыццём.

А вось самы малодшы вылучаўся адметнасцю, быў не падобны да іншых. Нават імя ў яго доўга не было. Маці Марфалогія прыставіла немаўля да Назоўніка, каб тое вучылася ў старэйшага розуму.

Спачатку Назоўнік дужа зарадаваўся: «Вось які я разумны, да мяне нават вучыцца ідуць!». Але хутка радасць прайшла. Пачаў Назоўнік злавацца на брата, скардзіцца маці:

— Што ж гэта такое?! Не паспела ў гэтага выскачкі малако на вуснах высахнуць, а ён ужо намагаецца замест мяне ў сказ улезці, маё месца заняць, замест майго імя выступае! Займеннік! Брыдкі займеннік! Сам жа нічога з сябе не ўяўляе! Толькі і дзяўбе адно: Я, ТЫ, МЫ, ВЫ, ЁН, ЯНА, ЯНО, ЯНЫ! Бач ты, асоба важная! ЗАЙМЕННІК! АСАБОВЫ ЗАЙМЕННІК!

Так і пачалі малодшага брата клікаць Займеннікам.

Канчаткова раззлаваўшыся на тое, што апошні выціскае яго са сказа, Назоўнік, калі маці Марфалогія некуды адхінулася, прагнаў Займенніка ад сябе і стаў працаваць адзін.

З гэтага атрымалася вось што: кніжкі стала нецікава чытаць. Ляжалі яны на паліцах, пакрываліся пылам. Занепакоілася Марфалогія і ўгаварыла старэйшага сына папрасіць прабачэння ў пакрыўджанага Займенніка, зноў прыняць яго ў тэксты. Паслухаўся маці ўпарты Назоўнік, хоць і вельмі цяжка было яму адступіць ад сваіх прынцыпаў. Ды толькі маці ніколі дзецям нічога дрэннага не параіць, таму яны заўсёды павінны яе слухацца!

З таго часу ўсе часціны мовы сталі жыць у згодзе і сяброўстве. І кніжкі больш не залежваліся на паліцах.

**Аляксандра БЕЛАЯ,**
**7 клас, Крывіцкая СШ,**
**Мядзельскі раён**


## ОАО «ВСК-Бел»

Учетный номер плательщика: **191410075.** Вид экономической деятельности: **строительство инженерных сооружений (45212)**
Организационно-правовая форма: **Открытое акционерное общество**
Орган управления: **собрание учредителей.** Единица измерения: **млн руб.** Адрес: **г. Минск, ул. Полевая, д. 24а, к. 8**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 года**

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2013 года | На 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | - | - |
| Нематериальные активы | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **-** | **-** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 1 | 1 |
| В том числе: материалы | 211 | 1 | 1 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 37 | 37 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 2 | 2 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 2 | 2 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | - | - |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **42** | **42** |
| **БАЛАНС** | **300** | **42** | **42** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2013 года** | **На 31 декабря 2012 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 14 | 14 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **14** | **14** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 15 | 15 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 13 | 13 |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 4 | 4 |
| по авансам полученным | 632 | - | - |
| по налогам и сборам | 633 | - | - |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | - | - |
| по оплате труда | 635 | 9 | 9 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | - | - |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **28** | **28** |
| **БАЛАНС** | 700 | 42 | **42** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2013 года**

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2013 года | За январь–декабрь 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | - | - |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | - | - |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | - | - |
| Управленческие расходы | 040 | - | - |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | - | - |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | - | - |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | - | - |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | - | - |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | - | - |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | - | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | - |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | - | - |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | - | - |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | - | - |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | - | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | - | - |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | - | - |
| Налог на прибыль | 160 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | - | - |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | - | - |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

**Руководитель** **Волков К.А.**

*Уважаемые акционеры ОАО «Слуцкий льнозавод»*

**23 марта 2015 г. в 11.00**
**СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
## ОАО «Слуцкий льнозавод»

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

*1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год и основных направлениях деятельности Общества в 2015 году.*
*2. Отчет наблюдательного совета Общества о работе в 2014 году.*
*3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год.*
*4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2014 год.*
*Утверждение распределения чистой прибыли за 2014 год. О выплате дивидендов за 2014 год.*
*Утверждение направлений использования чистой прибыли Общества на 2015 год и первом квартале 2016 года.*
*5. Избрание членов наблюдательного совета Общества.*
*6. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.*
*7. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*
*8. О даче согласия на получение государственной поддержки в 2015 году с последующим увеличением доли государства.*
*9. О принятии новой редакции Устава Общества.*

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 2 марта 2015 года.**

Время регистрации участников – в день проведения собрания **с 10.00 до 10.45 по адресу: ул. Ленина, 300.**

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

УНП 690657228 **Наблюдательный совет. (61865)**

---

Открытое акционерное общество
## «Гастроном «Блеск»

**сообщает, что 27 марта 2015 г. в 10.00**
***в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Гастроном «Блеск» от 17 февраля 2015 г.,***
**ПРОВОДИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ОЧНОЙ ФОРМЕ**
**Место нахождения Общества и место проведения собрания: 220019, г. Минск, ул. Шаранговича, 51**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2014 году и основных направлениях деятельности Общества на 2015 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2014 году. Оценка деятельности директора Общества Наблюдательным советом.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2014 год.
5. О распределении чистой прибыли за 2014 год. О выплате дивидендов за 2014 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2015 году и 1 кв. 2016 г.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений в Устав Общества.

